ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 5 (4257)
Серада, 6 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ — Рэалізацыя шасьці ўмоў перамогі—у цэнтр падрыхтоўкі да XIV зьезду КП(б)Б. К. В. ГЕЙ — Ліст тав. Сталіна і задачы партарганізацыі (2 стар.). Р. ШЭЛІН — Не зважаючы ні на што... (3 стар.). Р. РАСТОЎСКАЯ — Фабзавуч, як асноўная форма падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых (4 стар.).

Райпартканфэрэнцыі аднадушна ўхваляюць палітычную лінію ЦК КП(б)Б (2 стар.).

100 проц. пляну збожжазагатовак — да XIV зьезду КП(б)Б. Дабіцца рашаючай перамогі на ільназагатоўках (1 стар.).

Аньцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна — запука бесьперабойнай работы БелДРЭС (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ (3 стар.).

Рабоце сталовак — увагу гаспадарнікаў (3 стар.).

Індыя ў агні сялянскіх паўстаньняў (4 стар.).

У краіне ваенна-палявых судоў і шыбеніц (4 стар.).

Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі (1 стар.).

РЭАЛІЗАЦЫЮ ШАСЬЦІ УМОЎ ПЕРАМОГІ—У ЦЭНТР ПАДРЫХТОЎКІ ДА XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Паўтары гэкады адзяляе нас ад XIV зьезду КП(б)Б. Мы ўступілі ў паласу раённых партыйных канфэрэнцый. Наша задача—час, які застаўся да зьезду, максымальна выкарыстаць для поўнай мабілізацыі ўсіх сіл партыі і рабочай клясы па пасьпяховае вырашэньне гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад намі, на паляпшэньне якасьці работы па ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК, прыходзіць да свайго зьезду з вялізарнымі перамогамі генэральнай лініі партыі. Базьлітасная барацьба з правым і «левым» апартунізмам і прымірэнцтвам да яго, ажыцьцяўленьне 6 гістарычных умоў тав. **Сталіна** — забясьпечылі буйнейшыя сацыяльна-эканамічныя зрухі ў краіне, новыя рашаючыя посьпехі пралетарскай дыктатуры.

1931 год ператварыўся годам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Ленінскае пытаньне «хто-каго» вырашана ня толькі ў прамысловасьці, але і ў сельскай гаспадарцы на карысьць сацыялізму. Значэньне гэтых перамог цяжка пераацаніць.

Але гаворачы аб нашых выключных дасягненьнях, трэба з усёй вострасьцю падкрэсьліць, што мы ўсё-ж яшчэ выкарыстаілі поўнасьцю ўсіх тых вялізарных магчымасьцяй і пераваг, якія закладзены ў сацыялістычнай сыстэме нашай народнай гаспадаркі. Нашы посьпехі вялізарныя, але яны маглі быць яшчэ **большымі**.

Магчымасьці для гэтага былі і ёсьць. На паасобных участках пляновыя заданьні выкананы ня поўнасьцю. Так, прамысловасьць БССР, якая зрабіла гігантскі скачок наперад—69 проц. прыросту валавой прадукцыі—выканала гадавы прамфінплян па вядучай групе—ВОНГ—толькі на 83,4 проц. Недавыкананьне пляну ёсьць і па лініі загатовак.

Толькі невыкарыстаньнем усіх магчымасьцяй, недахопамі нашай работы трэба тлумачыць падобнае становішча. Тут з усёй пачэсьцю прымяняцца словы тав. Сталіна, які, даючы аналіз прычын падвыкананьня пляну, адзначаў, што іменна «не хапіла ўменьня скарыстаць наяўныя магчымасьці, не хапіла ўменьня правільна кіраваць заводамі, фабрыкамі, капальнямі».

Такім чынам, праблема карэннага паляпшэньня якасьці работы партыйных і гаспадарчых арганізацый, праблема палаўпшэньня кіраўніцтва ўсімі галінамі гаспадаркі паўстае ва ўсю шырыню, высоўваецца, як першачарговая задача ўсёй КП(б)Б.

Ключом да вырашэньня гэтай праблемы зьяўляецца поўнае ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна, рашучая перабудова ўсёй нашай работы на іх аснове.

У гэтых адносінах намі ўжо дасягнуты бясспрэчныя посьпехі. Па ўсіх 6 указаньнях разгарнулася вялікая творчая работа. Цэлы рад прадпрыемстваў дабіўся значнага паляпшэньня сваёй работы.

Дынаміка росту валавой прадукцыі прамысловасьці БССР дае яркі малюнак тых вялікіх зрухаў, якія забясьпечылі ператварэньне ў жыцьцё 6 умоў перамогі.

Калі ў другім квартале мінулага гаспадарчага году валавая прадукцыя прамысловасьці ў цэнтнарным азначэньні раўнялася 78.9 млн. руб., то ў трэцім квартале, пры аднолькавых у асноўным умовах, гэта сума рэзка павялічваецца і дасягае 102,7 млн. руб. Чацьверты квартал, ня гледзячы на рад затрудненьняў з электраэнэргіяй, паказвае лічбу ? 105,5 млн. руб.

Яшчэ больш цікавыя ў гэтым сэнсе паказальнікі па асобных галінах прамысловасьці.

Па мэталі выкананьне гадавога пляну ў першым паўгодзьдзі складала толькі 19 проц., у другім-жа паўгодзьдзі—41,5 проц. Валавая прадукцыя гарбарнай прамысловасьці ў першым квартале ў цэнтнарным азначэньні складала 4,8 млн. руб., у чацьвертым квартале—7.3 млн. руб. Па шэйнай прамысловасьці гэтыя паказальнікі адпаведна раўняюцца 35 і 59,9 млн. руб. і г. д.

Усе гэтыя факты наглядна паказваюць, як крута ўзьнялася ўверх крывая росту прадукцыі ў другім паўгодзьдзі.

Бясспрэчна, што гэтыя посьпехі сталі магчымы выключна дзякуючы перабудове работы на аснове 6 указаньняў тав. Сталіна. Толькі апартуністы, толькі палітычныя сьляпцы могуць ня бачыць тэй вялізарнай творчай работы, якая прароблена рабочай клясай пад кіраўніцтвам партыі з часу апублікаваньня гістарычнай прамовы тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў.

Але было-б цвартым бальшавікоў супакойвацца па дасягнутых посьпехах.

Абавязак кожнага камуніста, кожнай партарганізацыі з бальшавіцкай пастойлівасьцю змагацца за далейшае ператварэньне ў жыцьцё шасьці ўмоў тав Сталіна, за поўнае выкананьне на гэтай аснове ўсіх паказальнікаў пародна-гаспадарчага пляну.

Намі ўжо знойдзены канкрэтныя формы работы ў гэтых адносінах. Вялікая работа ўжо праведзена, але часта ёсьць факты, калі справа застаецца не даведзенай да канца, калі яна спыняецца на паўдарозе.

Возьмем для прыкладу пытаньне аб арганізаваным наборы рабочай сілы.

Гэта пытаньне ва ўмовах БССР асабліва актуальным зьяўляецца для лясной, тарфяной і будаўнічай галіны прамысловасьці. Тут найбольш востра адчуваецца недахват рабочых рук. Сыстэма дагавароў з калгасамі ўжо моцна ўвахопіць у практыку гаспадарчых арганізацый.

Але рэалізацыя дагавароў у цэлым разве выпадкаў праходзіць яўна незадавальняюча. І ў гэтым сіна як кантрактантаў, так і калгасаў, якія часам ня выконваюць яшчэ сваіх абавязацельстваў. Даволі ўказаць, што паводле дагавароў Лесбелу, на 15 сьнежня было завербавана замест 27.732 лесарубаў толькі 3 726 чалавек; па фурманках замест 25.089 — толькі 964.

Падобнае становішча з усёй вострасьцю патрабуе рашучага ўзмацненьня ўвагі партарганізацый да пытаньняў набору рабочай сілы, паляпшэньня арганізацыйна-масавай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў, узмацненьня барацьбы з апартуністычнай падасцэнкай гэтага важнейшага пытаньня, узмацненьня барацьбы з кулаком, які імкнецца сарваць выкананьне дагавароў.

Алначасова паўстае пытаньне аб правільным рэгуляваньні рабочай сілы ўнутры паасобных галін прамысловасьці. У радзе выпадкаў па прадпрыемствах ёсьць лішняя рабочая сіла. Так, у трэцім квартале па Шкэйф ядпаньні лішак рабочай сілы складаў 19 проц., па Скураб ядпаньні — 9,2 проц. Перад партыйнымі, гаспадарчымі і прафсаюзнымі арганізацыямі стаіць задача павышэньня пікбасьці ў пераразьмеркаваньні рабочай сілы, ніі больш рацыянальнага яе разьмеркаваньня ўнутры паасобных прадпрыемстваў і галін прамысловасьці.

Факты няўменьня давесьці справу да канца, невыстарчальнасьць кантролю выкананьня намечаных мерапрыемстваў ёсьць і па іншых галінах перабудовы работы на аснове шасьці ўмоў тав. Сталіна. Вельмі паказальна, што на паасобных прадпрыемствах і ў паасобных галінах работы ёсьць самы стракаты малюнак. Гэта тлумачыцца іменна рознай якасьцю перабудовы, розным зьместам і канкрэтнасьцю кіраўніцтва гэтай перабудовай.

Пэрыяд часу, які застаўся да XIV зьезду КП(б)Б, павінен стаць пераломным у дасягненьні максымальных тэмпаў работы, па ажыцьцяўленьні шасьці ўмоў тав. Сталіна. Гэта задача павінна стаць у цэнтры ўсёй падрыхтоўчай пердзьездаўскай работы.

Пад гэтым знакам павінны прайсьці раённыя партканфэрэнцыі. На гэту справу павінна быць мабілізавана актыўнасьць найшырэйшых працоўных мас.

Асаблівай увагі патрабуе па сабе задача рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна ў саўгасна-калгасным будаўніцтве. Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў—узьняцьце калгаснай вытворчасьці на вышэйшую ступень, рост прадукцыйнасьці працы на аснове барацьбы з абязьлічкай і ўраўнілаўкай, укараненьне пачаткаў гаспадарчага разрахунку ў саўгасным сэктары — усе гэтыя пытаньні патрабуюць свайго неадкладнага вырашэньня. Гэта будзе магчыма толькі тады, калі шэсьць умоў сапраўды лягуць у аснову арганізацыі працы ў калгасах і саўгасах.

У барацьбе з правым і «левым» анартунізмам і прымірэнцтвам да іх, на аснове выкананьня ўказаньняў правадыра партыі, КП(б)Б заваявала вялікія перамогі ў будаўніцтве сацыялізму.

Ударнай работай па поўным ажыцьцяўленьні гэтых указаньняў, у непрымірымай барацьбе з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, з кантрабандай контр-рэвалюцыйнага трацкізму, з гнілым лібэралізмам партарганізацыі яшчэ вышэй узьнімуць сваю баяздольнасьць, прыцуць да XIV партзьезду з новымі посьпехамі па ўсіх вучастках сваёй работы.

Рэалізацыя шасьці ўмоў перамогі—у цэнтр перадзьездаўскай падрыхтоўкі!

«Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку» (ЦК УсеКП(б)

100 ПРОЦ. ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК—ДА XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б!

Пасьпяховым выкананьнем і перавыкананьнем заданьняў заваяваць права на рапарт зьезду

АБ ХОДЗЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 5 студзеня 1932 г.

1. Адзначыць, што ня гледзячы на ўрэктывы ЦК УсеКП(б) і шматразовыя паказаньні ЦК КП(б)Б аб скапчэньні збожжазагатовак да 25 сьнежня, плян збожжазагатовак выканан на 1 студзеня 1932 году па БССР ў разьмеры 77,8 проц. Гэта тлумачыцца, як ужо ня раз падкрэсьлівалася ЦК, апартуністычнымі адносінамі раённых арганізацый да збожжазагатовак, дрэннай працай загатоўшчыкаў, адсутнасьцю правільнага аперацыйнага кіраўніцтва работай сельсаветаў, недапушчальна слабай работай сярод аднаасобнікаў, адсутнасьцю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва вакол выкананьня пляну загатовак і слабай барацьбой з кулацка-варожай агітацыяй, накіраванай на зрыў загатовак.

2. Адзначыць, што па асобных сэктарох ход збожжазагатовак таксама не забясьпечыў выкананьня гэтай пастановы партыі ў тэрмін.

Саўгасы — 92,6 проц., замест 100 проц. да 10-XII—1931 г.; калгасы — 93.8 проц., замест 100 проц. да 20-XII—1931 г.; аднаасобнікі — 68,7 проц., замест 100 проц. да 25-XII—1931 г.

3. Адзначыць надзвычайную стракатасьць у выкананьні пляну збожжазагатовак у раённым разрэзе. Так, на 1 студзеня выканалі і перавыкналі плян (на 100 проц. і больш) дзесяць перадавых раёнаў (Сураскі, Гомельскі, Асьвейскі, Уваравіцкі, Жыткавіцкі, Каралінскі, Сеньненскі, Сіроцінскі, Лёзьнянскі, Лепельскі). Набліжаюцца да выкананьня (ад 70 да 100 проц.) 12 раёнаў; ідуць на сярэднім беларускім узроўні (ад 70 да 90 проц.) — 27 раёнаў і адстаюць—25 раёнаў, з ліку якіх 14 раёнаў выканалі ад 60 да 70 проц. і 11 раёнаў знаходзяцца ў глыбокім тыле збожжазагатовак. ЦК і СНК асабліва адзначае ганебны правал па двух раёнах, дзе процант выкананьня надзвычай нізкі (Старыя Дарогі — 35 проц., Лельчыцы — 41,6 проц.).

ЦК КП(б)Б і СНК пастанаўляюць:

1 Адзначаючы значны пералом у здачы збожжа калгасамі, які высунуў калгасны сэктар на першае месца, ЦК і СНК побач з гэтым зварачаюць увагу ўсіх камуністаў, што працуюць у калгаснай сыстэме, як ў цэнтры, так і на месцах па тое, што калгасная сыстэма ў цэлым яшчэ ня выканала сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай. Асабліва адстаюць калгасы ў раёнах: Церахаўскім (30,3 %), Прапойскім (31,9 проц.), Старобінскім (45,6 проц.), Лепельскім (49,6 проц.), Рэчыцкім (45,8 проц.) Смалявіцкім (43,5 проц.), Чашніцкім (49 проц.), Веткаўскім (51,9 проц.).

Улічваючы поўную магчымасьць выкананьня пляну калгаснай сыстэмай, ЦК і СНК абавязваюць усіх камуністаў, усе партарганізацыі і кіраўніцтва РВК і РКС, калгасныя сыстэмы і загатоўчыя органы неадкладна разгарнуць шырокую палітычную кампанію пад лёзунгам 100-процантнага выкананьня пляну загатовак да XIV зьезду КП(б)Б.

Абавязаць Паркамзем тав. Рачыцкага, дырэктара Белмалпрамтросту тав. Сьмірнова пад іх асабістую адказнасьць забясьпечыць у пяцідзённы тэрмін стопроцантнае выкананьне пляну саўгаснай сыстэмай у цэлым.

2. Абавязаць райкомы КП(б)Б і РВК пастуных раёнаў: Стара-Дарожскага, Лельчыцкага, Рэчыцкага, Прапойскага, Мазырскага, Любаньскага, Лоеўскага, Камарынскага, Буда - Кашалёўскага, Чавускага, Койданаўскага, Бялыніцкага, Брагінскага, Глускага, Жлобінскага, Кармянскага, Клічаўскага, Пятрыкоўскага, Чэрвеньскага, Чачэрскага, Пухавіцкага, Чырвонапольскага, Веткаўскага, Выхаўскага, Хойніцкага, Магілеўскага, Расонскага, Чашніцкага, Шклоўскага, Барысаўскага, Касьцюковіцкага, Капыльскага, Парыцкага, Рагачоўскага, Старобінскага, Слуцкага, Вузьдзенскага і Чырвонаслабодзкага — дабіцца неадкладнага пералому ў збожжазагатоўках, падпарадкоўчы ўсю масава-палітычную работу ў раёнах гэтай задачы, а таксама шырока выкарыстаць для гэтай мэты раённыя партканфэрэнцыі, дзе яны яшчэ не адбыліся.

ЦК і СНК прапануюць кіруючым арганізацыям раёнаў, якія выканалі плян збожжазагатовак, узяць на буксір адстаючыя, а ўнутры адстаючых раёнаў арганізаваць буксіры з боку перадавых па выкананьні пляну сельсаветаў і калгасаў.

3. Абавязаць рэспубліканскі і пізавы друк безадкладна разгарнуць кампанію па ўцягненьні шырокіх мас калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў у барацьбу за сустрэчныя пляны, сацыялістычнае спаборніцтва і мэтады сацыялістычнага буксіру пад агульным лёзунгам «100 проц. выкананьня пляну да XIV партзьезду».

Даручыць Наркамзнабу і рэдакцыі газэты «Звязда» арганізацыю конкурсу на лепшае завяршэньне пляну збожжазагатовак, вылучыўшы за лік Наркамзнабу і загатоўчых арганізацый прэміяльны фонд у 10.000 руб. грашыма і 100.000 руб. прамтаварамі.

4. Неадкладна спагнаць з кулацка-заможных гаспадарак збожжа на цьвёрдых заданьнях.

Ліквідаваць адставаньне аднаасобнага сэктару

ШКЛОЎ. (Наш кар.).

Шклоўскі раён падышоў да чацьвертага, заключнага году пяцігодкі з недавыкананьнем збожжазагатоўчага пляну па 23,9 проц. Недавыкананьне ідзе выключна за лік аднаасобнага сэктару, які недапушчальна адстаў у ходзе загатовак. Па гэтым сэктары на 1-га студзеня заданьне выкананы толькі на 58.9 проц.

Слабы ход кампаніі сярод аднаасобнікаў зьяўляецца вынікам таго, што рад сельсаветаў недаацэньваюць ролю індывідуальнага сэктару ў загатоўках, палямяняюць масава-палітычную работу сярод беднякоў і сераднякоў апартуністычнай стаўкай па самацёк. У гэтых адносінах асабліва адзначаецца **Заходзкі** сельсавет, які выканаў заданьне па аднаасобным сэктары на 31 проц., **Яганаўскі** — на 31,3 проц., **Падгайцаўскі** — на 41,5 проц., **Фашчыўскі** — на 43,4 проц., **Б.-Лазіцкі** — 44,6 проц.

Зусім інакш пастаўлена работа ў **Славенскім і Мікіцінскім** сельсаветах, дзе збожжазагатоўкі праведзены на аснове разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы — сацспаборніцтва, ударніцтва, арганізацыі грамадзкага буксіру і г. д. Гэтыя сельсаветы ня толькі выканалі, але і перавыканалі свае гадавыя заданьні.

Некаторыя сельсаветы, замест рашучага націску на кулака, адносяцца прымірэнча да яго сабатажу, ня прымаюць мер да неадкладнага спагнаньня цьвёрдых заданьняў. Княжыцкі сельсавет, напрыклад, спагнаў цьвёрдыя заданьні толькі на 42 проц., **Нова-брашчынскі** — на 43 проц. і г. д.

Галвая задача Шклоўскай партарганізацыі, яе раённай канфэрэнцыі—ва ўтоб-там ні стала ліквідаваць у бліжэйшыя-ж дні адставаньне аднаасобнага сэктару ў збожжазагатоўках. Трэба націснуць на кулацка-заможныя гаспадаркі, прымусіць іх поўнасьцю і неадкладна выканаць цьвёрдыя заданьні.

Да XIV зьезду КП(б)Б Шклоўскі раён павінен ня толькі выканаць, але і перавыканаць гадавы збожжазагатоўчы плян.

Я. Новікаў.

Дабіцца рашаючай перамогі на ільназагатоўках!

Максымальна фарсаваць тэмпы апрацоўкі і здачы валакна

ЦК КП(б)Б у сваёй сьнежаньскай пастанове аб ільназагатоўках канстатаваў зусім незадавальняючы ход апрацоўкі ільну як на калгасах, так і па аднаасобным сэктары.

За гэты час многія калгасы ўзмацнілі тэмпы пераапрацоўкі і здачы валакна дзяржаве. Рад калгасаў ужо выканаў пляны з перавышэньнем.

Аднак, агульнае выкананьне пляну ільназагатовак па БССР усё яшчэ праходзіць вельмі слаба.

Дырэктывы партыі і ўраду аб узмацненьні канкрэтнага штодзённага кіраўніцтва з боку Наркамзнабу, Белкалсаюзу і Ільнакапапляводсаюзу раённымі загатоўчымі арганізацыямі, пераключэньні ўвагі на правільную арганізацыю пераапрацоўкі, поўным выкарыстаньні машын, разгортваньні сацыялістычных мэтадаў працы, арганізацыі буксіру адстаючым не знайшлі выстарчальнага адбітку ў рабоце раду арганізацый.

Паведамленьні з месц (Бабруйск) сыгналізуюць аб тым, што да гэтага часу ільнаапрацоўчыя пункты поўнасьцю не загружаюцца. Ёсьць выпадкі, калі машыны паогул не выкарыстоўваюцца.

Толькі бязьдзейнасьцю і апартуністычнай практыкай некаторых мясцовых арганізацый і работнікаў, адсутнасьцю разгортваньня масавай работы, невыкананьнем заданьняў па апрацоўцы і здачы ільну, невыстарчальным націскам на кулацка-заможныя гаспадаркі можна тлумачыць ганебнае заставаньне раду кават такіх ільнаводных раёнаў, як Дубровенскі і інш.

Галвая задача ўсіх партыйных, савецкіх і загатоўчых арганізацый — максымальна фарсаваць тэмпы апрацоўкі і здачы ільнавалакна дзяржаве.

Да XIV зьезду КП(б)Б дабіцца рашаючай перамогі у выкананьні пляну ільназагатовак. Раённыя арганізацыі павінны неадкладна мабілізаваць усе сілы і дабіцца права рапартаваць зьезду партыі аб выкананьні пляну ільназагатовак.

Кулацка-рвацкім тэндэнцыям не даецца адпору

БАБРУЙСК.

Рымавецкі сельсавет праяўляе поўную бязьдзейнасьць у правядзеньні ільназагатовак і палкам спадзяецца на самацёк. Сельсавет не забясьпечыў сыстэматычнага кіраўніцтва кампаніі і абмяжоўваецца толькі рэзалюцыямі.

Сельсавет не дае адпору кулацка-рвацкім тэндэнцыям, якія маюць месца ў радзе калгасаў—імя Молатава, імя Камінтэрну і г. д. Вопыт калгасу «Глуша», які па-бальшавіцку змагаўся за лён, выканаўшы сваё заданьне з перавышэньнем, не перанесен у іншыя калгасы сельсавету.

Амаль ні адна кулацка-заможная гаспадарка ня выкапала цьвёрдых заданьняў. Але сельсавет ня прымае мер, каб гэтыя заданьні спагнаць.

Спажыўтаварыства таксама нічога ня робіць да фарсаваньня загатовак. Работнікі сельспажыўтаварыства рэдка выязджаюць на месцы.

Рымавецкі сельсавет павінен неадкладна падягнуцца. Трэба рашуча ўдарыць па кулацка-рвацкіх тэндэнцыях у паасобных калгасах, узмацніўшы націск на кулацка-заможныя гаспадаркі.

К.

140 проц. заданьня

АСЬВЕЯ.

У КАЛГАСЕ «ШЛЯХ КАМУНІЗМУ» НА ТРАПАНЬНІ ІЛЬНУ ЎВЕСЬ ЧАС ПРАЦАВАЎ АДЗІН ТРАПАЛЬШЧЫК. ТАКОЕ СТАНОВІШЧА СТАВІЛА ПАД ПАГРОЗУ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗДАЧЫ ІЛЬНАВАЛАКНА Ў ТЭРМІН.

ПАРТ'ЯЧЭЙКА ПРЫНЯЛА РАД МЕР ДА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ АПРАЦОЎКІ. ЦЯПЕР У КАЛГАСЕ ЗАНЯТА НА АПРАЦОЎЦЫ 14 ТРАПАЛЬШЧЫКАЎ. СУТАЧНЫЯ ЗАДАНЬНІ ВЫКОНЕАЮЦЦА НА 140 ПРОЦ. ЛЁН ЗДАЕЦЦА НА НІЖЭЙ 5-ГА НУМАРУ.

НАПЕРАДЗЕ ПА ВЫКАНАНЬНІ НОРМЫ ТРАПАНЬНЯ ІДУЦЬ КАЛГАСЬНІК СЯМЕНІК, ЯКІ АПРАЦАВАЎ 16 КГР., АСОКА — 16 КГР. І СКРЫПКА (КАМСАМОЛКА) — 10-12 КІЛЁГРАМ.

ЛЕПШАЯ ЎДАРНІЦА Ў БРЫГАДЗЕ МЯЛЬШЧЫКАЎ ІЛЬНУ — ГЯРОДНІК ЛЮДВІГА, А ПА СУШЦЫ — КАЛЯДА ПІЛІП.

Поўнасьцю нагрузіць ільнамялкі

ЛЕЗНА.

Па Дабрамысьлянскім сельсавеце да гэтага часу не дасягнута значнага зруху ў апрацоўцы ільнавалакна. З трох ільнамяльных пунктаў з поўнай нагрузкай працуе толькі адзін. На іншых пунктах апрацоўка праходзіць чарапашымі тэмпамі ў адну зьмену. У калгасе «Новы ўсход» ёсьць 4 ільнамяльныя пункты, але ўсе яны працуюць з перабоямі, па 2-3 дні ў тыдзень.

Кулацка-заможныя гаспадаркі сабатуюць ільназагатоўкі. З 30 кулацка-заможных гаспадарак толькі 6 прыцягнуты да адказнасьці за зрыў ільназагатовак. Некаторыя члены сельсаветаў—Лабаноўская, Жвыкаў, Каралёў — прымірэнча адносяцца да кулака.

Сельсавет і парт'ячэйка не аддаюць увагі ільназагатоўкам і не разгарнулі вакол гэтай справы масава-растлумачальнай работы сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. П. С.

6 студзеня

Прайшла першая пяцідзённка чацьвертага завяршаючага. Мы ня маем яшчэ афіцыяльных даных аб вынніках збожжазагатовак за гэтыя пяць дзён. Але шматлікія паведамленьні з месц дазваляюць ужо зрабіць папярэдніх арыентовачныя вывады.

Рад раёнаў і сельсаветаў, якія да 1 студзеня г. г. мелі невялікае недавыкананьне гадавых заданьняў, за першую пяцідзённку ліквідавалі сваю запазычанасьць перад дзяржавай.

Аднак, значная частка раёнаў усё яшчэ не дабілася належнага зруху ў ходзе кампаніі, не разгарнула яшчэ такіх тэмпаў, якія-б забясьпечылі поўнае і пасьпяховае завяршэньне збожжазагатовак да 14-га зьезду КП(б)Б.

У прыватнасьці няма яшчэ пералому па **Рэчыцкім і Шклоўскім** раёнах, аб якіх мы сёньня зьмяшчаем матэрыялы. Тут па-ранейшаму збожжазагатоўчая кампанія ў большасьці сельсаветаў прахоўзіць самацёкам, без выразнага плянава-аперацыйнага кіраўніцтва.

Характэрным для гэтых раёнаў зьяўляецца зусім слабы ход спагнаньня цьвёрдых заданьняў — вынік невыстарчальнага націску на кулацка-заможныя элементы, яўна прымірэнчых адносін паасобных сельсаветаў і работнікаў да кулацкага сабатажу збожжазагатовак. Асабліва гэта адчуваецца на Рэчыцкім раёне, дзе цьвёрдыя заданьні спагнаны ўсяго на 26,1 проц.

Слабае разгортваньне, а месцамі поўнае ігнараваньне масава-палітычнай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў, невыстарчальны націск на кулацтва, адсутнасьць рашучай барацьбы з яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі — вось прычыны, якія трымаюць паасобныя раёны ў глыбокім тыле збожжазагатоўчай кампаніі.

Засталася рашаючая дэкада. Да XIV зьезду КП(б)Б усе адстаўшыя раёны абавязаны прысьці з поўным выкананьнем і перавыкананьнем сваіх гадавых пляноў.

Там, дзе няма аперацыйнага кіраўніцтва

РЭЧЫЦА.

Рэчыцкі раён — адзін з адсталых раёнаў па збожжазагатоўках. На 1-га студзеня замест 1.800 тон збожжа, вызначаных гадавым планам, загатоўлена толькі 1.057 тон, або 58,7 проц.

Адставаньне раёну ў гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі тлумачыцца тым, што некаторыя кіруючыя раённыя арганізацыі ня зволі забясьпечыць правільнае плянава-аперацыйнае кіраўніцтва загатоўкамі, не мабілізавалі масы калгаснікаў і аднаасобнікаў на барацьбу за поўнае і своячасовае выкананьне кантрактацыйных дагавароў і самаабавязацельстваў.

У радзе калгасаў («Чырвоны партызан», «Чырвоны маяк» і іншыя) яшчэ ня зжыты кулацка-рвацкія тэндэнцыі, якія распальваюцца кулацтвам і яго агентурай сярод адсталых калгаснікаў. Гэтым тлумачыцца, што калгасны сэктар цягнецца ў глыбокім тыле збожжазагатовак і на 1-га студзеня выканаў плян здачы збожжа толькі на 45.8 проц. Райкалгасаюз, многія сельсаветы і праўленьні калгасаў не разгарнулі масавай работы сярод калгаснікаў, не арганізавалі іх па барацьбу з кулацкай агітацыяй.

Недапушчальна слабы націск на кулацка-заможныя элементы ў большасьці сельсаветаў прыводзіць амаль да поўнага зрыву выкананьня цьвёрдых заданьняў. Апошнія спагнаны ўсяго на 26,1 проц.

Кулакі і заможнікі пралазяць у загатоўчы апарат з тым, каб, з аднаго боку, вызваліцца ад цьвёрдых заданьняў, а з другога — весьці падрыўную работу ў самім апараце. Так, у апараце райкалгасаюзу «працуе» заможнік Чарнейка, які сам атрымаў цьвёрдае заданьне па збожжазагатоўках і яго ня выконвае.

Патрэбны самыя рашучыя меры, каб забясьпечыць максымальнае фарсаваньне тэмпаў збожжазагатовак, як па калгасным, так і па аднаасобным сэктары. Трэба давесьці рашучую барацьбу з правымі і «левымі» апартуністамі, якія, выконваючы волю клясавага ворага, срываюць загатоўкі збожжа.

Сакін.

Саратаў. Начальніку камбайнбуду тав. Сьмірнову і дырэктару камбайнзаводу імя Шабалдаева—тав. Ветчынкіну

Прывітаньне рабочым і работніцам і ўсяму кіруючаму складу заводу, палкія вітаньні актыву заводу, і перш за ўсё ударнікам і ударніцам, — з пасьпяховым скапчэньнем будаўніцтва і пускам заводу.

Таварышы! Камбайны патрэбны краіне на мешп, чым трактары і аўтамашыны. Ня сумняваюся, што дабіцеся посьпеху ў справе поўнага выкананьня вытворчай праграмы заводу. Наперад, да новых перамог!

СТАЛІН.

Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі

Вывазка торфу

Плян 4 кварталу 1931 году па вывазцы торфу выканан толькі на 42 проц. Белторф вывез 65.2 проц. заданьня, спажыўцы — 31,5 проц.

Выраб новых будматар'ялаў на клімавіцкім сілікатным заводзе

КЛІМАВІЧЫ. Клімавіцкі сілікатны завод рэарганізован у камбінат па выробе новых будматар'ялаў. Абсталёван новы цэх па выпуску стандартных дамоў з фібраліту. Дырэктар заводу тав. Разуеў выйшаў новую мяшалку і машыну для замочкі стружак, што дае рост прадукцыйнасьці працы на 100 проц. і эканоміі каля 100 тыс. руб. у год.

Рапарты пераможцаў

АСІПОВІЧЫ. Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі і шырокай масавай рабоце сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, разгортваньню сацыялістычных мэтадаў працы, Асіповіцкі раён выканаў плян мабілізацыі сродкаў 4-га кварталу на 101,8 проц.

ЛЮБАНЬ. Фінплян 4-га кварталу па 1 студзеня выканан на 107,4 проц. Ударная работа працягваецца.

Пушчана магутная штамповачная фабрыка

АДЭСА. Пушчана новая штамповачная фабрыка Скурпрамбінату, абсталяваная паводле апошніх слова тэхнікі. У 1932 годзе фабрыка дасьць 8 млн. камплектаў розных дэталяй абутку. Фабрыка будзе снабжаць паўфабрыкатам абутковыя фабрыкі Украіны.

Красноўральскі медпаплавільны камбінат увайшоў у строй

КРАСНОЎРАЛЬСК. 1-га студзеня пушчан буйнейшы ў Эўропе Красноўральскі медпаплавільны камбінат. Намаганьнямі рабочых, інжынэраў і тэхнікаў пад кіраўніцтвам партыі створан гігант каляровай мэталюргіі — першыпца пяцігодкі каляровых мэталяў.

Савецкая аўтаматычная вага

КІЕЎ. Завод аўтаматычнай вагі і вымяральных прыладаў Трэсту «Укрвесвэтр» скончыў выраб першай савецкай аўтаматычнай вагі для цукровай прамысловасьці, паклаўшы тым самым канец імпарту гэтай вагі з-за межаў.

Запалена другая коксавая батарэя

КУЗЬНЕЦКБУД. Ударнікі будаўніцтва атрымалі новую перамогу: запалена другая коксавая батарэя ў складзе 55 печай. Тэмпэратура ў першай коксавай батарэі даведзена да 780 градусаў.

Новая перамога Днепрабуду

БІЧКАС. На Дняпроўскай запрудзе скончана глыбокае сьвідраваньне і цэмэнтаваньне 43 асноў запруды. Гэта забясьпечвае пуск дняпроўскіх турбін да 1 мая 1932 году.

Пушчана новая домна

ВЫКСА. Пасьля капітальнага рамонту ў доменным цэху Выксунскіх заводаў пушчана домна № 1, якая будзе даваць 200 тон чыгуну ў суткі.

Гарбарня „Бальшавік" выканала сьнежаньскую праграму па 100,5 проц.

Чырвонасьцяжная Менская гарбарня «Бальшавік» выканала вытворчую праграму за сьнежань на 100,36%. Найлепшыя паказальнікі даў 1 хромавы цэх—100,5 проц.

Прамфінплян за 6 пяцідзённку сьнежня выканан на 78,23 проц.

Вынаходка рабочага Крыўчыка

Рабочы менскага аўтагаражу тав. Крыўчык пераканструяваў складаныя часткі для аўтамашыны сыстэмы «Пітойер» (плянуючыя пасьцярэдкі і чарвячныя валікі), якія раней увозіліся з-за мяжы. Выпрабаваньне рэканструяваных частак дало станоўчыя вынікі. Выраб іх каштуе на 20 процантаў таньней замежных.

Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі

Вывазка торфу

Плян 4 кварталу 1931 году па вывазцы торфу выканан толькі на 42 проц. Белторф вывез 65.2 проц. заданьня, спажыўцы — 31,5 проц.

Выраб новых будматар'ялаў на клімавіцкім сілікатным заводзе

КЛІМАВІЧЫ. Клімавіцкі сілікатны завод рэарганізован у камбінат па выробе новых будматар'ялаў. Абсталёван новы цэх па выпуску стандартных дамоў з фібраліту. Дырэктар заводу тав. Разуеў выйшаў новую мяшалку і машыну для замочкі стружак, што дае рост прадукцыйнасьці працы на 100 проц. і эканоміі каля 100 тыс. руб. у год.

Рапарты пераможцаў

АСІПОВІЧЫ. Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі і шырокай масавай рабоце сярод калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, разгортваньню сацыялістычных мэтадаў працы, Асіповіцкі раён выканаў плян мабілізацыі сродкаў 4-га кварталу на 101,8 проц.

ЛЮБАНЬ. Фінплян 4-га кварталу па

На раённых партканфэрэ.

Райпартканфэрэнцыі аднадушна ўхваляюць палітычную лінію ЦК КП(б)Б

Поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў усіх відаў загатовак—важнейшая ўмова пасьпяховай падрыхтоўкі да XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі

Бальшавіцкімі мэтадамі работы дабіцца неадкладнага выкананьня ўсіх плянаў загатовак

Пры ўдзеле 114 дэлегатаў адкрылася Пятрыкоўская райпартканфэрэнцыя. Першым канфэрэнцыя заслухала даклад ЦК КП(б)Б, зроблены тав. Жолудавым.

У справаздачным дакладзе райкому сакратар РК тав. Новікаў даў самакрытычны аналіз работы партарганізацыі за мінулыя 16 месяцаў.

Партыйная арганізацыя прыйшла да сваёй канфэрэнцыі з радам посьпехаў. Але гэтыя посьпехі далёка невыстарчальныя ў параўнаньні з тымі задачамі, якія на дадзным этапе ставіць партыя.

Пятрыкоўскі раён мае ўсе магчымасьці для пасьпяховага правядзеньня палітычных і гаспадарчых кампаній. Трэба толькі па-баяўому перабудаваць работу і мабілізаваць, арганізаваць масы на вырашэньне вузлавых задач.

Якраз гэтага не хапала ў рабоце Пятрыкоўскай партарганізацыі. У пагоні за голымі лічбамі, за дутымі пропантамі калектывізацыі партарганізацыя выпусьціла з-пад увагі галоўную задачу — арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў.

Раённыя арганізацыі свалачасова атрымалі пляны на ўсіх відах загатовак, але на іх выкананьне ня былі мабілізаваны масы, вакол загатовак ня была разгорнута палітычна масавая работа. Рад ячэек масавую работу падмянілі адміністраваньнем, «лявацкімі» перагібамі. У Белнаўскім сельсавеце з 313 цэнтн. плану збожжазагатовак 227 цэнтн. ішло па лініі цьвёрдых заданьняў. Апалёгічнае становішча і ў Глініцкім і Кашэвіцкім сельсаветах. Ясна, што цьвёрдымі заданьнямі быў закрануты ня толькі серадняк, а ў радзе выпадкаў і бяднацкія гаспадаркі.

Дасяткі дэлегатаў канфэрэнцыі ў сваіх выступленьнях указвалі, што калі-б усе партыйныя ячэйкі па-баяўому мабілізавалі масы на практычнае ажыцьцяўленьне вузлавых задач, калі-б уся партарганізацыя перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі, то асноўныя гаспадарча-палітычныя кампаніі былі-б праведзены з посьпехам.

На канфэрэнцыі мела месца вылазка апартуністаў. Сакратар Грабаўскай ячэйкі Мушкавец, аллюструючы кулацкую ідэалёгію, імкнуўся ахаяць калгасы і ўвесь калгасны рух. Дырэктар саўгасу Масьлюкевіч імкнуўся давесьці перыферыйнасьць плянаў, намечаных партыяй і ўрадам па разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Ня лішнім тут будзе напомніць, што гэты кулацкі агент Мушкавец, будучы кіраўніком саўгасу, сарваў сіласаваньне, ня ўжываў ніякіх мер для правільнай арганізацыі работы.

Партыйная канфэрэнцыя дала жорсткі адпор апартуністам Мушкаўцу і Масьлюкевічу, да канца выкрыла «лявацкія» загібы, якія мелі месца ў асобных парт'ячэйках.

Партыйная канфэрэнцыя мабілізавала ўсю партарганізацыю на барацьбу супроць правых і «левых» апартуністаў, на барацьбу з трацкісцкай кантрабандай і ліберальнымі адносінамі да ўхілаў ад лініі партыі.

Канфэрэнцыя аднадушна прызнала палітычную лінію ЦК КП(б)Б правільнай і практычную работу здавальняючай.

Пятрыкоўская партарганізацыя за апошні год вырасла на 33 проц. Гэта абавязвае не яшчэ больш разгарнуць марксыцка-ленінскае выхаваньне, на аснове шырокай распраўноўкі ліста тав. Сталіна павысіць ідэйна-палітычны ўзровень партыйных мас.

Задача партыйнай арганізацыі — дабіцца карэннага перазому ў рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, разгарнуць палітычна-масавую работу вакол загатовак з тым, каб рапэтываць падыходзячаму 14 зьезду КП(б)Б і 17 усесаюзнай партканфэрэнцыі аб сваіх посьпехах у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній. К.

Барацьбу за якасьць--у цэнтр увагі

Закончыла сваю работу Полацкая раённая партканфэрэнцыя. Канфэрэнцыя абмеркавала палітычны даклад ЦК КП(б)Б, справаздачны даклад райкому КП(б)Б, даклад РКК і задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Партарганізацыя Полаччыны забясьпечыла сваёй работай значнае павялічэньне росту валавой прадукцыі па прамысловасьці як рэспубліканскага, так і мясцовага значэньня.

Аднак, вялізарныя капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць, пры ўмовах правільнай арганізацыі працы на вытворчасьці ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, маглі-б даць яшчэ большую вытворчую эфэктыўнасьць. Калі бясспрэчны дасягненьні ў выкананьні вытворчай праграмы па колькасных паказальніках, дык пытаньне якасьці застаецца самым вузкім месцам у рабоце вытворчых парт'ячэек. Напрыклад, замест зьніжэньня сабекошту прадукцыі на лесазаводзе, сабекошт павышан на 30 проц. Па цагельні павышэньне сабекошту складае 4 рублі на кожную тысячу цэглы. Такое-ж становішча і па арцелях райпрамсаюзу.

Такія дрэнныя паказальнікі якасьці, значнае недавыкананьне вытворчай праграмы рядам прадпрыемстваў (лесазавод, цагельня, с. г. майстэрні і інш.) тлумачыцца выключна слабой работай парт'ячэек гэтых прадпрыемстваў. Канфэрэнцыя абавязала ўсю рабочую партарганізацыю завяршыць перабудову работы на аснове поўнай рэалізацыі шасьці ўмоў т. Сталіна, якія вырашаюць пасьпяховае выкананьне вытворчай праграмы.

Змаганьнем за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб транспарце Полацкая партарганізацыя забясьпечыла некаторыя зрухі ў рабоце чыгуначнага вузла. Сярэдне-сутачны прабег параво заў выкананы за 3 квартал на 100 проц., за 2 месяцы 4-га кварталу — на 97 проц.

Калі ў гэтых адносінах становішча можна прызнаць больш-менш здавальняючым, дык нецярпімымі застаюцца масавыя выпадкі зрыву спаранай ежды і іншыя недахопы ў рабоце чыгункі. У трэцім квартале было 222 выпадкі зрыву спаранай ежды, за 2 месяцы 4-га кварталу — 79 выпадкаў. Ня выконваюцца вымяральныя па прастоі паравозаў і свалачасовай ад праўцы цягнікоў.

Задачы выкананьня плянаў асенне-зімовых перавозак настойліва вымагаюць ад партарганізацыі паляпшэньня работы транспарту, што можна і павінна быць дасягнута на аснове выкананьня шасьці сталінскіх умоў і бязьлітаснай барацьбы з коснасьцю і бюракратызмам у рабоце раду адміністрацыйна-гаспадарчых зьвеньняў чыгункі.

Удзельная вага сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ў раёне вымяраецца 59.3 процантамі. У радзе сельсаветаў завершана суцэльная калектывізацыя, на гэтай аснове ліквідуецца кулацтва як кляса. Есьць значныя дасягненьні ў разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, галоўным чынам па лініі камплектаваньня малочна-таварных і сьвіна-таварных калгасных фэрм. Партыйная арганізацыя канцэнтруе сваю ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, на задачах далейшай бязьлітаснай барацьбы супроць кулака і яго агентуры — правых і «левых» апартуністаў і прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

Да канфэрэнцыі партарганізацыя Полаччыны забясьпечыла 100 проц. выкананьня плянаў збожжазагатовак. Канфэрэнцыя абавязала ўсю раённую арганізацыю дабіцца 100 проц. выкананьня плянаў ільназагатовак да 14-га зьезду КП(б)Б.

А. Мінуціі.

Пад знакам барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў

Крупская райпартарганізацыя прыйшла да сваёй 17-ай партканфэрэнцыі з радам посьпехаў у практычным ажыцьцяўленьні задач сацыялістычнага будаўніцтва. За час з 16-ай партканфэрэнцыі прамысловасьць раёну вырасла на 6 адзнак, у ліку якіх два ільназаводы. Асноўныя прадпрыемствы—лесазавод і цагельня—перавыканалі свой прамфінплян.

За гэты час арганізаваны 4 новыя жывёлагадоўчыя саўгасы на плошчы 8.000 га. Больш поўмільёна рублёў укладзена на будаўніцтва гэтых саўгасаў. Калектывізавана 58 проц. бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. У рабоце райпартарганізацыі па калектывізацыі ёсьць рад буйнейшых недахопаў. Дырэктывы партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў не знайшлі яшчэ належнага адлюстраваньня ў рабоце раённай арганізацыі. З 240 калгасаў пераведзены на зьдзельшчыну толькі 168, прычым зьдзельная работа практыкавалася толькі ў галіне паляводзтва. У 70 калгасах раёну дагэтуль ня поўнасьцю агрэмаджаны рабочая жывёла і сельска-гаспадарчы інвэнтар. Партарганізацыя слаба кіравала работай на разьмеркаваньні ўраджаю ў калгасах. У выніку гэтага ў некаторых калгасах папярэдняе разьмеркаваньне ўраджаю ў калгасах праведзена бяз уліку колькасьці і якасьці працы, а на прынцыпе кулацкай ураўнялаўкі.

Ні ў адным калгасе дагэтуль не ліквідавана абязьлічка. Апартуністычнае кіраўніцтва калгасу «Бальшавік», пад выглядам ліквідацыі абязьлічкі, раздае інвэнтар і рабочую жывёлу членам арцелі, чым па сутнасьці разваліла калгас. Адсутнасьць барацьбы з абязьлічкай, злачынная безгаспадарчасьць давялі да таго, што ў самым буйным калгасе раёну «Хацюковы» разбазарана амаль увесь с.-г. інвэнтар. У калгасах усіх слаба паставлена масавая выхаваўчая работа, не вядзецца рашучая барацьба са спажывецкімі, кулацкімі тэндэнцыямі, якія маюць месца ў радзе калгасаў.

У результаце адсутнасьці масавай работы і слабай барацьбы з апартуністамі на практыцы, плян загатовак выкананы па ільне толькі на 25 проц., збожжы — 81 проц., бульбе — 79 проц.

Камплектаваньне стада, асабліва на СТКФ і цялячых фэрмах, яўна незадавальняючае. Плян на СТКФ выкананы на 55 проц. і цялячых фэрмах — на 46 проц. Белыя дрэнна стаіць справа з гадоўляй маладняка. У калгасе імя Леніна, «Бальшавік», «Чырвоны вострыё», «Перамога», «Савецкая Беларусь» разбазаравы сотні штук маладняка.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што раённае партакіраўніцтва невыстарчальна змагалася за рэалізацыю загады ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі. Правапартуністычная практыка ў рабоце РК і РКК і вялізных партыйных ячэек перапяталася з «лявацкімі» перагібамі. У Шыпякоўскім сельсавеце галаваны «лявацкага» пашыбу направа і налева даводзілі цьвёрдыя заданьні да серадняцкіх і нават бяднацкіх гаспадарак.

На рабоце раённай партарганізацыі вельмі кепска адбіваліся адсутнасьць правільных узаемаадносін паміж РК КП(б)Б і РКК. Мэтадам бальшавіцкай самакрытыкі канфэрэнцыя выкрыла ўсе гэтыя недахопы ў рабоце арганізацыі і апартуністычныя скажэньні дырэктыў партыі.

Канфэрэнцыя ўхваліла пастановы ЦК КП(б)Б і ЦКК аб зьняцьці з работы сакратара РК тав. Асінскага і старшыні РКК тав. Брыгуса, якія ня здолелі забясьпечыць пасьпяховае выкананьне чарговых задач партыі.

Канфэрэнцыя прызнала палітычную лінію ЦК КП(б)Б правільнай і работу па ажыцьцяўленьні задач сацыялістычнага будаўніцтва — здавальняючай. Вялікую ўвагу аддала канфэрэнцыя пытаньням, высунутым у лісьце тав. Сталіна. Канфэрэнцыя патрабуе ад усёй раённай партарганізацыі павышэньня клясавай пільнасьці, бязьлітасна змагаючыся супроць усякіх праяўленьняў апартунізму, супроць кантрабанды контр-рэвалюцыйнага трацкізму і гнілога лібералізму.

Канфэрэнцыя абавязала сябе мабілізаваць на правядзеньне ўсіх відаў і асабліва ільназагатовак, каб поўнасьцю выкананы загатоўчыя пляны да XIV зьезду КП(б)Б.

Крупская раённая партыйная арганізацыя зьяўляецца здаровай, яна зможа ліквідаваць папушчаныя недахопы, па-бальшавіцку ажыцьцяўляць цэнтральную задачу ў вёсцы — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ператварэньне раёну ў санраўды спецыялізаваны ільназводчажывёлагадоўчы.

Н.

Адкрылася Шклоўская райпартканфэрэнцыя

ШКЛОЎ. (Па тэлеф. ад нашага кар.). Адкрылася Шклоўская райпартканфэрэнцыя, якая праводзіць сваю работу пад знакам мабілізацыі ўсёй партыйнай арганізацыі на поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў усіх відаў загатовак, на ажыцьцяўленьне асноўных задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Райпартканфэрэнцыя ў ганаровы прэзыдыум выбрала т. т. Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Рудзутака, Тэльмана, Ленскага, Гея, Галадзеда, Шаранговіча.

З дакладам ЦК КП(б)Б выступіў тав. Міцькоў.

Райпартканфэрэнцыю віталі ўдарнікі фабрыкі «Спартак» і гуты імя Сталіна.

У прывітальных тэлеграмах, пасланых ЦК УсеКП(б), тав. Сталіну, ЦК КП(б)Б і «Зьвязьдзе», райпартканфэрэнцыя заяўляе, што па-бальшавіцку выраўніць усе пытаньні, якія стаяць у парадку дня яе работы.

ГЛУШЫЦЕЛЯЎ САМАКРЫТЫКІ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ

ПАСТАНОВА ПАРТКАЛЕГІІ ЦКК КП(б)Б

АБ ЗАЦІСКУ КРЫТЫКІ І САМАКРЫТКІ Ў КАПЫЛЬСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫ

Заслухаўшы даклад камісіі ЦК КП(б)Б і ЦКК, якая выяжджала 26-га лістапада 1931 году для праверкі магар'ялаў аб адносінах капыльскага раённага кіраўніцтва да раённага друку, парткалегія ЦКК КП(б)Б канстатуе:

1. Факты аб заціску самакрытыкі, паведамленыя газэтай «Правда», «Зьвязда» і «Рабселькор» ад 27 сьнежня 1931 г. — цалкам пацьвердзіліся.

2. Крытыка і самакрытыка ў раёне разгорнута зусім слаба і ня стала на гадам усёй работы капыльскай арганізацыі ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Найпасьцю антысерадняцкіх перагібаў, пад мена масавай работы грубым адміністраваньнем і камандаваньнем зьявіліся вынікам таго, што Капыльскі раён значна адстае па ўсіх важнейшых гаспадарча-палітычных кампаніях. За апошні час меўся рад выпадкаў грубейшага заціску самакрытыкі.

а) Дыскрэдытацыя і выгнаньне брыгад, складзеных з селькораў, ударнікаў і калгаснікаў, у двух сельсаветах (Песачанскі — старшынёю калгасу тав. Плітам і старшынёю сельсавету т. Котам; Белікараеўскі — сакратаром ячэйкі тав. Мікалаенкай і старшынёю сельсавету. Брыгада друку выгнана з райкалгассаюзу старшынёю праўленьня т. Шэмбелем). Заява Загорскага (нам. старшыні райкалгассаюзу) аб тым, што «пісакі перашкаджаюць працаваць і што іх трэба гнаць».

б) Шматлікія факты зрываў насьценгазэт (Пацейкі саўгас «Савічы», «Бабоўня», калгас «Пралетарская праца» і інш.).

в) Заява на сходзе рабочых аднаго з старшынь рабкомаў (ён-жа сакратар ячэйкі), што калі яго будуць крытыкаваць, дык ён застрэліцца (Ярашэвіч).

г) Пагрозы з боку пасобных кіруючых работнікаў сельсавету па адрасе рэдкалегіі насьценгазэты (Сташэўскі, Адамчук).

3. Парткалегія ПКК КП(б)Б лічыць, што ня гледзячы на ўсім выразныя дырэктывы ЦК і ЦКК КП(б)Б аб разгортваньні крытыкі і самакрытыкі ў сувязі са справай 167 (масавы арышт сялян беднякоў і сераднякоў у 1930 годзе, а таксама ў сувязі з выпадкам грубага заціску самакрытыкі на камбінаце) — капыльскае раённае партыйнае кіраўніцтва ня ўлічыла ўрокаў мінулага і не мабілізавала парторганізацыю на барацьбу за развіцьцё бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

4. Факт з выгнаньнем брыгад друку зьяўляецца адной з новых форм барацьбы клясава-варожых элемэнтаў супроць рабселькораўскага руху і вынікам уплыву на пасобныя зьвеньні савецка-калгаснага апарату і пасобных членаў партыі з боку клясава-варожых элемэнтаў.

Бюро капыльскага РК КП(б)Б ня ўлічыла гэтага і не мабілізавала парторганізацыю на рашучую барацьбу і свалачасовае зьнішчэньне спроб клясавага ворага і яго агентуры заціскаць самакрытыку.

5. Бюро РК КП(б)Б і прэзыдыум РКК на факты грубага заціску самакрытыкі рэагавалі з недапушчальным спазьненьнем. Пастаноўка і вырашэньне гэтых пытаньняў з боку бюро РК і прэзыдыуму РКК зьяўляюцца праяўленьнем гнілога лібералізму і прыкладам змазваньня палітычнай сутнасьці пытаньня.

6. Парткалегія ЦКК КП(б)Б падкрэсьлівае недапушчальнае становішча калі райвыканком, райком ЛКСМБ, райкалгассаюз, пракуратура, міліцыя і інш. яўна ігнаравалі як заметкі, што зьмяшчаюцца ў раённым і цэнтральным друку, так і тыя рабселькораўскія допісы, што пасылаюцца на расьсьледаваньне (райвыканком, пракуратура, накідалі па 6-8 месяцаў заметкі без адказу). Такое ігнараваньне друку і рабселькораў прадстаўляе сабой імкненьне з боку апартуністычнага кіраўніцтва прытупіць бальшавіцкі друк, «як самую моцную, самую вострую зброю партыі» (Сталін).

7. Бюро РК КП(б)Б не разгарнула работы з рабселькорамі, вынікам чаго зявіўся: заняпад кіраўніцтва работай сярод рабселькораў з боку значнай часткі парт'ячэек.

8. Лічыць недапушчальным, што бюро райкому не рэагавала на ганебны факт арышту рэдактара — члена бюро райкому — тав. Анішчука, які да гэтага часу шчэ не рэабілітаваны.

Выходзячы з гэтага парткалегія ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Сакратару РК т. Мурашкевічу за ўзначаленьне заціску самакрытыкі і настойлівае імкненьне замазаць дапушчаныя грубыя палітычныя памылкі нават насьля пастановы бюро РК (выступленьне на сходзе местачковай ячэйкі з заявай аб тым, што «крытыка і самакрытыка ў раёне ўзнялася на вышэйшую ступень»), за падмену масавай работы грубым адміністраваньнем—абавязьціць вымову і зьняць з работы. Лічыць недастатковым скарыстаньне т. Мурашкевіча на кіруючай партыйнай рабоце па працягу двух год.

2. Бюро РК КП(б)Б за палітычна шкадлівую навыцную у апэнды фактаў заціску самакрытыкі і фактычны пераход на шлях заціску самакрытыкі — абавязьціць вымову.

3. Прэзыдыуму РВК за дапушчаную імі грубую палітычную памылку, якая заключаецца ў адсутнасьці праверкі рэагаваньня з боку раённых арганізацый на зьмешчаныя ў друку заметкі і прысланыя на расьсьледаваньне рабселькораўскія допісы і не давалі рашучую пастаноўку пытаньня аб становішчы самакрытыкі ў раёне—абавязьціць вымову.

4. Справу аб заціску самакрытыкі з боку членаў КП(б)Б т. Шэмбеля (выгнаньне брыгады друку), Загорскага (апраўданьне ўчынку і погляды т. Шэмбеля), а таксама справу т. Янкоўніса — вынесьці асобна і разглядзець на адным з чарговых пасяджэньняў ЦК і ЦКК КП(б)Б.

5. Адзначыць, што рэдактар газэты т. Анішчук правільна і свалачасова ставіў перад бюро РК пытаньне аб становішчы крытыкі і самакрытыкі ў раёне.

6. Накіраваць адказнага члена ПК і ЦКК КП(б)Б на раённую партканфэрэнцыю, даручыўшы яму інфармаваць канфэрэнцыю аб дадзай пастанове парткалегіі, звярнуўшы ўвагу арганізацыі на необходнасьці рашучага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі ў арганізацыі і правядзеньні работы з рабселькорамі.

7. Лічыць необходным прапанаваць гэтай пастановы ва ўсіх партарганізацыях.

8. Прасіць ЦК КП(б)Б правесьці дэтальнае абсьледаваньне Капыльскай райпартарганізацыі.

9. Пастанову апублікаваць у друку.

Сакратар парткалегіі ЦК КП(б)Б СУХАНАВА.

Перабудова партработы вырашае вытворчыя посьпехі

Бюро парткалектыву цэхі Аршанскага чыгуначнага вузла па-сапраўднаму ўзялося за перабудову партыйнай работы па-новому. Рад цэхавых ячэек, на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, дасягнуў значных посьпехаў у выкананьні вытворчых задач.

Лепшым прыкладам перабудовы партыйнай работы і забясьпечэньня пасьпяховага выкананьня трансфінплану зьяўляецца партыйная ячэйка кацельнага цэху. Уся работа ячэйкі праводзіцца на падставе канкрэтнага плану прыстасаванага да ўмоў поўнага вытворчага вучастку. У плане паказана, якія мерапрыемствы трэба ажыцьцявіць ячэйцы і партыйным групам, ці члена тэрміну і хто персанальна адказвае за выкананьне гэтых мерапрыемстваў.

Кацельны цэх поўнасьцю пераведзен на гаспадарчы разрахунак і прэміяльна-зьдзельную аплату працы. Асаблівая ўвага зьвернута на вучэт эфэктыўнасьці працы кожнага рабочага. Поўная кантактнасьць у рабоце брыгадных трыкутнікаў характэрна для кожнай брыгады кацельнага цэху. Штодня пасьля скончэньня работы брыгадныя трыкутнікі праводзяць 10-хвілёўныя вытворчыя нарады, на якіх падагульваецца праведзеная работа і вызначаюцца вытворчыя ліміты на наступны дзень.

Паміж усімі брыгадамі цэху шырока разгорнута сацыялабарэйства і ўдарніцтва. Выкананьне дагавору сыстэматычна правяраецца. Усё гэта забясьпечыла ў кацельным цэху значнае перавыкананьне вытворчага плану, павышэньне якасьці работы. На працягу 2-х месяцаў якасьць капітальнага паўторнага рамонту паравозаў. Працаёмкасьць дымагарных трубаў, па ацэнцы кацельнічыкаў, не пагаршаецца. За дэкабрэ ацэнка дагавор па кацельным цэху выканан на 111 проц.

Партыйная ячэйка шырока разгарнула работу па марксыцка-ленінскім выхаваньні і арганізацыі тэхнічнай асьветы. Партыйным пікетам і тэхнічнымі гурткамі ахоплены ўсе рабочыя цэху. Вытворчая работа ячэйкі ўзмоцнена з работай сярод лепшых ударнікаў па падрыхтоўцы іх да ўступленьня ў партыю. За два месяцы ячэйка вырасла на 17 чалавек. Рост ячэйкі ў параўнаньні з большасьцю адбываецца за лік старых кадравікоў з 25-30 гадовым вытворчым стажам, лепшых ударнікаў вытворчасьці.

Зараз партыйны калектыў разгарнуў падрыхтоўку да 14 зьезду КП(б)Б і 17-й партканфэрэнцыі УсеКП(б). Гэта падрыхтоўка праводзіцца пад знакам ажыцьцяўленьня ўказаньняў тав. Сталіна.

Камуністы зьяўляюцца ўзорам у ударнай работы, ідуць у авангардзе ўдарнікаў. Напрыклад член партыі мацыяніст Янкулёўідзе першым на конкурсе за лепшую спаранку ежы. Ён на сваім паравозе № 97-89 зрабіў пробег 2044 клм. ізаўёўны сугачную работу паравозу да 15 гадзін.

Бюро парткалектыву ставіла задасьленьне перанясьненьне вопыту перадавых ячэек і асобных груп на іншыя цэхі і ўдарнікоў на ўсіх цэхах.

Кінер.

К. В. Гей

ЛІСТ ТАВ. СТАЛІНА І ЗАДАЧЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ*)

IV. Нацыянал-ухілісцкія вылазкі на тэарытычным фронце і задачы барацьбы за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыяльнасьці

Як па канкретны, падзвычай выразны, прыклад праўленьня ўхілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, необходна паказаць на зборнік «Навука на службе нацдэмаўскай контр-рэвалюцыі», які выйшаў пад рэдакцыяй тав. Вальфсона. Гэты зборнік як ва ўступным артыкуле Вальфсона, так і ў іншых артыкулах мае ў сабе многа фармулёвак вялікадзяржаўніцкага зьместу, праганяе погляды вялікадзяржаўных шавіністаў.

Ня будзем падаваць усіх гэтых месц; пакажам толькі на той абзац, дзе Вальфсон, крытыкуючы нацыянал-дэмакратаў, піша:

«Нацдэмы ставілі сваю стаўку на тое, каб, гіпэртрофуючы нацыянальную форму, ператвараючы яе ў ф[illegible], тым самым нэйтралізаваць сацыялістычны зьмест нашай культуры, вынучыўшы з яе кляснае, ператвараць яе ў буржуазную».

Тут у Вальфсона прастае ўказаньне на тое, што разьвіцьцё нацыянальнай формы пройдзе ці зьместарскі зьмест культуры. Гэта характэрна для погляду усіх ухілістаў да вялікадзяржаўнага шавінізму. Вальфсон крытыкуе нацыянал-дэмакратызм не за клясавароны зьмест работы нацдэмаў, не за тое, што яны—яны клясавыя ворагі—імкнуліся падарваць пралетарскую дыктатуру, імкнуліся на тэрыторыі Савецкай Беларусі паспаваць Беларусь фашысцкую.

У кнізцы «Навука на службе нацдэмаўскай контр-рэвалюцыі» дапушчаны пагардлівыя, насьмешлівыя адносіны да дробнай культуры і быту: вышывак, слуцкіх паясоў і г. д.

Некаторыя пасобныя таварышы займаюцца абывательскімі гутаркамі, нібы з Вальфсона робяць вялікадзяржаўнага ўхілыста.

З Вальфсона вялікадзяржаўнага ўхілыста ніхто ня робіць. Ён сам зьяўляецца канкрэтным пасьлядоўным ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму. Вальфсон замест таго, каб да крытыкі нацыянал-дэмакратызму падыйсьці з партыйных, з бальшавіцкіх пазыцый, падыйшоў з пазыцый ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму.

Тое-ж самае трэба сказаць і адносна тав. Выдры, які, крытыкуючы беларускі контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм, у радзе сваіх работ скаціўся да ўхілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму.

Гэтыя факты з усёй выразнасьцю гавораць аб тым, што ўхілісты да вялікадзяржаўнага шавінізму імкнуцца працягнуць сваю ідэалёгію ў навуковыя работы, на тэарытычны фронт.

Задача ўсёй КП(б)Б — яшчэ больш мабілізавацца на барацьбу супроць трацкісцкай кантрабанды і разам з гэтым узмацніць сваё змаганьне супроць ухілаў у нацыянальным пытаньні як у практычнай рабоце, так і ў тэорыі. Барацьба за партыйнасьць навукі, за марксыцка-ленінскую чыстату нашага тэарытычнага фронту зьяўляецца суставной, неадлучнай часткай нашага агульнага змаганьня за поўную перамогу сацыялізму.

Актывізацыя ўхілу да вялікадзяржаўнага шавінізму звычайна супадае з актывізацыяй ўхілаў да мясцовых шавіністаў. І зараз, у часе актывізацыі ўхілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, ў пас, у КП(б)Б, ёсьць некаторыя аднакі актывізацыі ўхілу да мясцовага беларускага шавінізму.

ЦК і ЦКК у сваёй пастанове, заваст[illegible] ражны ўвагу партарганізацыі на ўзмацненьні барацьбы з ухілам да вялікадзяржаўнага шавінізму, з усёй сілай падкрэсьліваюць, што, ня гледзячы на тое, што нацыянал-дэмакратызм разьбіт, партыйныя арганізацыі павінны павышаць сваю пільнасьць і выкрываць усялякія спробы беларускіх шавіністаў атаманаваць генэральную лінію партыі.

Як па канкретны прыклад праўленьня ўхілу да беларускага шавінізму, я маю на ўвазе паказаць на кнізку тав. Шчарбакова — «Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і беларуская акупацыя». У кнізцы пагонт ролі рабочай класы ў рэвалюцыі ёсьць такое месца:

«У вогуле мы на Беларусі мае[illegible] на[illegible]рэдзілі вайны, можа пасоўле ня зусім дакладных падлікаў, наступную пралетарскую і поўпралетарскую армію гораду і вёскі: рабочых фэрэчных—85 тыс., с.-г. рабочых—да 300 тысяч, здыходных, на заработкі—да 700 тыс., сярод іх, праўда, даў давесьці вялікі процант серадняцкага сялянства, рамесьніку — 200 тысяч чалавек. Усяго, такім чынам, мы мае[illegible] менш 1 мільёна чалавек пралетарскіх і поўпралетарскіх мас. Гэта вялізная масо зьўлялася рэзэрвам рэвалюцыі».

Такое разуменьне ролі рабочай класы ў рэвалюцыі непрыймовае. Яно вынікае з неразуменьня, ці з нежаданьня разумець ролю пралетарыяту, як гегемона сялянства.

Далей, у гэтай-жа кнізцы мы чытаем:

«Але ня толькі сярод сялянскай масы бальшавіцкая арганізацыя і Менскі савет мабілізавалі сілы пралетарскай рэвалюцыі. Мабілізаваны гэтых сіл ішла і па лініі рабочай класы».

Зноў такі Шчарбакоў малюе ролю рабочае к[illegible] ў Кастрычніцкай рэвалюцыі не як ролю гегемона, а як ролі адпаго з «разэрваў» рэвалюцыі.

У кнізцы Шчарбакова рад буйных памылак і па пытаньнях характарыстыкі нацыяналістычных дробна-буржуазных партый. Па-першае, тав. Шчарбакоў не дае хоць у якой-небудзь меры выстарчальнай крытыкі нацыяналістаў, яўна ступоўвае іх контр-рэвалюцыйную ролю ў пэрыяд барацьбы рабочай класы за перамогу Кастрычніка па Беларусі. У адным месцы пазат ёсьць такая думка, што:

«Калі-б беларускія нацыяналісты ішлі з масамі, калі-б яны здолелі арганізаваць рэальную сілу і выступіць супроць часовага ўраду... калі-б аб'ектыўна гралі рэвалюцыйную ролю. На жаль, мы гэтага за беларускімі нацыяналістамі ня бачылі, а мо'[illegible]маль ня бачылі».

З падпага зусім ясна, што Шчарбакоў ня толькі не выкрывае клясавых карэньняў нацыяналістына-контрэвалюцыі ў Беларусі, а, наадварот, спочуваецца да простай капуляризаваны буржуазных і дробна-буржуазных нацыяналістычных партый. Адначасова з гэтым тав. Шчарбакоў перапавялічвае памылкі КП(б)Б. КП(б)Б у першы пэрыяд кастрычніцкай рэвалюцыі па Беларусі мела асобныя памылкі. Але-ж нельга гэтыя памылкі пралетарыяту так, што бальшавіцкая арганізацыя Беларусі і Заходняга фронту па ставіла перад сабой задачы ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнасьці. Гэта яўнае скажэньне гісторычнай сапраўднасьці.

Сказаць, што бальшавіцкія арганізацыі Беларусі ня ставілі перад сабой задачы вырашэньня нацыянальнае праблемы, гэта будзе простым паклёпам на нашу партыю, якая в самага пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі пакладала ўжыла практычныя меры для ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі аб праве нацый на самавызначэньне. У рабоце па ажыцьцяўленьні гэтага лёзунгу былі дапушчаны асобныя памылкі. Партыя іх ня ўтойвае. Перапавялічэньне гэтых памылак грае на руку нацыяналістычным элемэнтам у іх барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту.

З усяго падпага вышэйшае што падчыняя арганізацыі, парткомы і ячэйкі [illegible] паўхілна павышаць бальшавіцкую пільнасьць мас, накіроўваючы іх актыўнасьць на непрымірымую барацьбу супроць усякіх скажэньняў партыйнай лініі ў тэорыі і на практыцы. Ставячы гэту задачу, необходна папярэдзіць, што ў барацьбе за чыстату партыйнай лініі трэба раз і назаўсёды пакінуць з усякага роду абывательскім [illegible]ходам да прынцыповапалітычных пытаньняў. Трэба пакончыць з усякага роду спробамі папраўльна разьмеркаваць агонь бальшавіцкага змаганьня, даць яму пікравільны напрахак.

Агонь непрымірымай барацьбы павінен быць накіраваны на сапраўдных ухілістаў ад лініі партыі. Агонь бязьлітаснай зьнішчальнай крытыкі трэба накіраваць па кантрабандыстах контрэвалюцыйнага трацкізму, якія працягваюць варожыя партыі ідэі, па гнілых ліберальных прымірэнчых адносінах да ўхілаў ад лініі партыі. Адначасова ні ў якім разе не павінна быць аслаблена барацьба супроць правага апартунізму, які прадстаўляе галоўную небясьпеку на дадзным этапе, супроць усіх скажэньняў ленінізму ў тэорыі і на практыцы.

Уся наша партарганізацыя, нашы партыкомы і ячэйкі павінны зразумець, што на аснове распраўдкі ліста тав. Сталіна партыя вядзе жорстокую барацьбу ня толькі супроць скажэньняў гісторыі бальшавізму. Справа ідзе аб барацьбе сёкешняга дня, аб нашай палітыцы, аб барацьбе за сацыялізм. Уся КП(б)Б павінна правяць лічэ большую непрымірымасьць, яшчэ большую красьць да усякага роду ўхілаў і хістаньняў, паставіўшы справу так, каб кожная партыйная ячэйка свалачасова атакоўвала розныя ўхілы і хістаньні ад генэральнай лініі партыі, ня здраду справе пралетарыяту. Задача кожнай ячэйкі, кожнага нізавога партыйнага зьвяна — з усёй цьвёрдасьцю і настойлівасьцю ачышчаць свае рады ад тых элемэнтаў, якія працягваюць у рады нашай партыі варожыя бальшавізму погляды і тэорыі.

*) Канец. Пачатак гл. у № 2, 3, 4, «Зьвязды».

Ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна — зарука бесьперабойнай работы БелДРЭС

Першая БелДРЭС падыйшла да чацьвертага заключнага са значным недавыкананьнем прамфінпляну. За апошнія два з паловай месяцы, пачынаючы з кастрычніка, станцыя не давала даяржаве звыш 870.000 кілёват-гадзін электраэнэргіі. Гэта вялікая запазычанасьць коцца адбіраецца на рабоце прадпрыемстваў буйных прамысловых цэнтраў БССР. Адміністрацыя і адказныя партыйныя работнікі БелДРЭС (Разумовіч, Дутлаў і інш.) імкнуцца вытлумачыць адставаньне недахватам апалу, дрэнай работай Асінторфу і г. д. Аднак, усе гэтыя «абгрунтаваньні» ёсьць нішто іншае, як «аб'ектыўныя прычыны», за якія так любяць хаваць сваю ненаваротлівасьць махровыя апартуністы.

Партыйная і прафэсыянальная работа не перабудавана

Асноўкай прычынай перабояў у рабоце БелДРЭС зьяўляецца адсутнасьць належнага партыйнага кіраўніцтва станцыяй з боку партыйнага калектыву, а таксама Аршанскага райкому партыі.

У БелДРЭС'е ў палучасьці ўсе даныя для таго, каб з посьпехам выконваць і перавыконваць прамфінплян. Трэба было толькі правільна расставіць сілы, арганізаваць работу так, каб кожны рабочы адчуваў адказнасьць за пэўны вытворчы участак, каб ініцыятыва рабочага калектыву была накіравана на пасьпяховае выкананьне вытворчых праграм. Ажыцьцяўленьне 6 сталінскіх умоў перамогі — зарука бесьперабойнай работы БелДРЭС.

Аднак, да перабудовы партыйнай работы бюро партарганізацыі БелДРЭС падыйшло фармальна, не давяло яе да канца. Арганізаваныя пахавыя ячэйкі і асабліва партгрупы не атрымліваюць ад бюро калектыву належнай дапамогі і кіраўніцтва, не ўлічваюць сутнасьці работы ў цэху і брыгадзе, не адчуваюць адказнасьці за становішча выкананьня прамфінпляну на тым ці іншым вучастку вытворчасьці.

Усё гэта прывяло да таго, што па БелДРЭС да гэтага часу не ажыцьцёўлены ўказаньні тав. Сталіна.

Да гэтага часу амаль усе цэхі БелДРЭС не пераведзены на гаспадарчы разрахунак, не гаворачы ўжо аб арганізацыі разрахункавых брыгад — гэтай вышэйшай формы сацыялістычнага спаборніцтва.

Абязьлічка ў рабоце і ўраўнілаўка ў зарплаце — характэрны для многіх цэхаў і брыгад. Ужо некалькі разоў разглядаліся тарыфныя стаўкі, але належных вынікаў да гэтага часу няма. Улік работы адсутнічае, прагрэсыўна-прэміяльная аплата працы ня ўведзена.

Адміністрацыя БелДРЭС злачынна адносіцца да арганізацыі работы нават на вядучым вучастку вытворчасьці — у кацельным цэху. Зараз у гэтым цэху бесьперапынна працуюць тры катлы ў той час, як нават пры нагрузцы 9-10 тыс. кілёват-гадзін станцыя можа працаваць на двох катлох. Пры рабоце трох катлоў БелДРЭС, па сутнасьці, зусім дарэмна, непрадукцыйна спальвае ў дзень звыш 100 тон торфу.

Усё гэта — вынік таго, што ў кацельным цэху пазьвычай нізкая прадукцыйнасьць працы, прапоўная дысцыпліна далёка не на належнай вышыні. Звыш 30 проц. торфу не згарае, нападае ў попел, часта ніск ў катлох падае і станцыя прымушана выключаць з сеткі спажыўцоў энэргіі.

Рашаючай умовай перавозу станцыі на работу двох катлоў зьяўляецца інтэнсыфікацыя працы ў кацельным цэху, сумленныя адносіны качагараў да выкананьня сваіх абавязкаў. Толькі поўная ліквідацыя ўраўнілаўкі ў зарплаце, прэміяльна - прагрэсыўная зьдзельшчына, абгрунтаваная на дакладным уліку працы, забясьпечваюць патрэбную эфэктыўнасьць у рабоце кацельнага цэху, а разам з гэтым і ўсёй БелДРЭС.

Рацыяналізатарскія прапановы ў канцылярскіх нетрах

Бюро партколектыву нічога не зрабіла для таго, каб разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Сацдагавары ўвесь час не правяраліся, эфэктыўнасьць працы ўдарнікаў ня ўлічвалася, ударнікі, як правіла, не прэміяваліся. Чаго, напрыклад, варты такі факт? У свой час загадчык тэрфандадачы тав. Кунцэвіч мэханізаваў работу эстакады, ад якой залежыць забясьпячэньне топак апалам. Гэта мэханізацыя дае БелДРЭС звыш 10.000 рублёў эканомі ў год. Між тым, пікяга матар'яльнага заахвочваньня выканаўца Кунцэвіч не атрымаў.

Шмат рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых загінула ў бюракратычных нашках адміністрацыі БелДРЭС. Характэрным зьяўляецца ўжо тое, што па БелДРЭС'е доўгі час бюро рацыяналізацыі кіраваў «камсамолец» Гофман, які лічыў, што на БелДРЭС'е, дзе «ўсё пабудавана паводле апошняга слова тэхнікі, рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў быць ня можа». Толькі пасьля таго, як камісія ЦК КП(б)Б выкрыла апартуністычную сутнасьць падобных разважаньняў, бюро партыйнага і камсамольскага калектываў паставі і пытаньне аб выключэньні Гофмана з камсамолу.

Ахова працы і матар'яльна-бытавое абслугоўваньне рабочых БелДРЭС пастаўлена дрэнна. Тэхніка бясьпекі пастаўлена зусім дрэнна; рабочым шкодных для здароўя галін прамысловасьці (зольнае, кацельнае аддзяленьні і інш.) не выдаецца спэцвопратка, спэцхарчаваньне ня ўведзена. Ня вызначаны асобы, якія павінны атрымліваць палепшанае харчаваньне. На лепш стаіць справа з грамадзкім харчаваньнем і забясьпячэньнем рабочых кватэрамі. У выніку — нізкая прадукцыйнасьць працы, і цякучасьць рабочай сілы.

Работа ў школах партыйнай сеткі сыстэматычна зрываецца. Да гэтага часу ліст тав. Сталіна ў часопісь «Пролетарская революция» не распрацоўваўся.

Безадказнасьць і абязьлічка

Адной з асноўных прычын перабояў у рабоце БелДРЭС зьяўляецца безадказныя адносіны да сваіх абавязкаў з боку кіруючых работнікаў чыгункі Асінторфу, якая адыгрывае рашаючую ролю ў справе забясьпячэньня БелДРЭС апалам. Некалькі тыдняў назад Асінторф узяў на сябе абавязацельства — стварыць на станцыі да 1 студзеня 1932 году запас торфу ў 7.000 тон. Гэта абавязацельства ня выканана. І ў гэтым выпадку «аб'ектыўныя прычыны» адыгралі ролю шыльды, за якою імкнуцца схавацца апартуністы з Асінторфу.

У Асінторфе адчуваецца значны недахват вагонтак. Паравозы выкарыстоўваюцца толькі на 40-50 проц. Між тым, кіраўніцтва Асінторфу не пакланацілася аб тым, каб забясьпечыць свае вагонныя майстэрні патрэбнымі матар'ялам і гэтым самым ліквідаваць недахват вагонтак. Ня меншая віна за гэта падае на Белторф. Усё-ж трэба адзначыць, што паваг і з нацыянай колькасьцю вагонтак, пры ўмове поўнага выкарыстаньня ўнутраных рэсурсаў, правільнай расстаноўкі рабочай сілы абавязацельства магло быць выканана.

Дрэнная работа чыгункі тлумачыцца ў першую чаргу тым, што партыйная ячэйка ня цікавілася вытворчымі пытаньнямі, не кіравала вытворчым жыцьцём чыгункі. Паравозныя брыгады да гэтага часу працуюць па-старыцы. Сацыялістычныя формы і мэтады работы не разгорнуты. На чыгунцы вельмі дрэнныя жыльёвыя ўмовы. Некаторыя кваліфікаваныя работнікі (машыністы, качагары і інш.) прымушаны хадзіць па работу за 4-8 клм. Працоўная дысцыпліна зусім на нізкім узроўні. З-за нядбайнасьці машыністаў пяродка бываюць выпадкі аварыйнасьці.

* * *

Значная доля віны за тое становішча, у якім апынуўся БелДРЭС, падае на долю арганскага райкому партыі і яго органу — раённай газэты «Ленінскі прызыў». Ні РК КП(б)Б, ні газэта не пацікавіліся своячасова становішчам станцыі, не рэагавалі на выпадкі апартуністычнай практыкі кіраўніцтва БелДРЭС'у. Нават пасьля таго, як на БелДРЭС'е працавала камісія ЦК КП(б)Б, якая намецілі рад практычных мерапрыемстваў для забясьпячэньня бесьперабойнай работы электрастанцыі, РК КП(б)Б не пакланаціўся аб тым, каб гэтыя мерапрыемствы былі праведзены ў жыцьцё, не дапамог партыйнай арганізацыі БелДРЭС перабудаваць сваю работу па-новаму. Характэрным зьяўляецца той факт, што замест зьнятага сакратара парткалектыву. РК КП(б)Б рэкамендаваў парткамітэт БелДРЭС т. Ласко, які, будучы на пасадзе дырэктара саўгаса Высокае (таго-ж раёну), праводзіў праваапартуністычную практыку.

Разгарнуць падрыхтоўку да XIV зьезду КП(б)Б

Зараз апартуністычнае кіраўніцтва БелДРЭС зьнята. У апошнія дні на аснове рэалізацыі ўказаньняў т. Сталіна, мабілізацыі ўсёй рабочай грамадзкасьці станцыі на ліквідацыю ўсіх недахопаў у яе рабоце крывая выкананьня прамфінпляну рэзка пачала зьніжацца. Калі раней станцыя давала ў гадзіну ня больш за 2.500-3.000 квт., дык зараз гэта лічба ўзрасла да 9.500 кв. Аднак, дасягнутыя посьпехі далёка невыстарчаюць. Нават больш таго, посьпехі не замацаваны. Задача — перайсьці на работу двох катлоў — яшчэ не ажыцьцёўлена. Вопыт перадавых змагароў за прамфінплян не папулярызуецца, не гераносіцца па адстаючыя вучасткі. Так, «сквозная» камсамольская брыгада, якая сыстэматычна перавыконвае вытворчыя ліміты, замкнута ў сваіх рамках, ня мае належнага падтрыманьня з боку бюро парткалектыву і заўкому.

Зараз перад партарганізацыяй БелДРЭС стаіць адказная задача — разгарнуць падрыхтоўку да XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі УсеКП(б) пад знакам ліквідацыі запазычанасьці мінулага году, падрыхтоўкі да выкананьня павялічаных праграм чацьвертага, заключнага году пяцігодкі на аснове рэалізацыі пасьлядоўнай умоў т. Сталіна.

Для таго, каб з посьпехам ажыцьцёвіць гэту задачу, партыйная арганізацыя БелДРЭС павінна неадкладна ператварыць у жыцьцё сакавіцкую пастанову ЦК УсеКП(б) аб перабудове партыйнай работы, аб увядзеньні трохступеневай структуры партыйных і прафсаюзных арганізацый.

Партыйныя сілы павінны быць расстаўлены так, каб кожны вучастак вытворчасьці, асабліва вядучых яе галін, быў забясьпечан партыйным уплывам, штодзённым і канкрэтным парткіраўніцтвам.

Пралетары адказнейшага вучастку прамысловасьці БССР могуць выканаць і бязумоўна выканаюць задачы, пастаўленыя перад імі партыяй.

Вынязная брыгада «Зьвязды» — КІПЕР, ДАШКЕВІЧ.

Агляд друку

Прытупленьне бальшавіцкай пільнасьці („Савецкая Беларусь")

Трацкісцкія кантрабандысты і фальсыфікатары пралазяць у самыя рознастайныя шчыліны, надзяюць самыя рознастайныя маскі, каб праз браму гісторыі рэалізаваць асновы марксызму-ленінізму і працягваць свае контррэвалюцыйныя «тэорыі». Эпігоны збанкрутаваўшага трацкізму пад сьцягам люксамбургіянства імкнуцца сказіць гісторыю бальшавізму, выкарыстоўваючы гнілы лібералізм пасобных камуністаў.

Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарской революции» з усёй сілай выкрыў трацкісцкіх кантрабандыстаў і фальсыфікатараў гісторыі нашай партыі. Тав. Сталін ва ўсю вышыню паставіў перад партыяй задачу павышэньня бальшавіцкай пільнасьці, задачу непрымірымай барацьбы з усякай трацкісцкай кантрабандай і гнілым лібералізмам. Роля нашага друку ў выкананьні гэтых важнейшых палітычных задач, асабліва адказная.

* * *

Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарской революции» «С. Б.» доўга і ўпарта ігнаравала. Газэта спакойна праміла міма гэтага важнейшага палітычнага дакумэнту, мабілізаваўшага ўсю партыю на бязьлітасную барацьбу з трацкісцкімі кантрабандыстамі і фальсыфікатарамі — зброеносцамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, з гнілым лібералізмам. Прынамсі ў лістападзе аб лісьце тав. Сталіна рэдакцыя «С. Б.» проста не ўспамінала.

Яркі факт. 17 лістапада «С. Б.» зьмяшчае перадавую аб задачах перавыбараў парторганаў. У перадавой — ні слова аб лісьце тав. Сталіна, ні слова аб задачах барацьбы з трацкісцкімі кантрабандыстамі, ні намёку на неабходнасьць непрымірымага выкрываньня усякіх праяўленьняў гнілога лібералізму. Яшчэ адна характэрная асаблівасьць: «С. Б.» ставіць крыж на барацьбе з прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі. Перадавая газэты зусім не падкрэсьлівае, што партыйныя арганізацыі павінны біз усякай літасьці змагацца з прымірэнцтвам да правага ¥ «левага» апартунізму і да ўхілаў у нацыянальным пытаньні.

Гэта — невыпадковасьць. У перадавой аб задачах раённых партканфэрэнцый (8 сьнежня) штадпуюцца тыя-ж самыя памылкі. Гісторыя паўтараецца. Зноў поўнае маўчаньне аб барацьбе з прымірэнцтвам да ўхілу ад лініі партыі. Ліст тав. Сталіна, як і раней ігнаруецца. Аб ім — ні слова. Аб мабілізацыі партыйных мас на барацьбу з трацкісцкімі кантрабандыстамі і ўсякімі фальсыфікатарамі, з гнілым лібералізмам — ні аднаго радка.

Гэту перадавую між іншым «Зьвязда» неадкладна раскрытыкавала, выкрыўшы яе шкодныя палітычныя памылкі. «С. Б.», аднак, на нашу крытыку рэагавала далёка несвачасова. Праходзіць дзень, другі, трэці, праходзіць тыдзень — газэта маўчыць. На палітычныя абвінавачваньні, прад'яўленыя да яе перадавой — нішчага адказу.

І ў далейшых нумарох «С. Б.» — істотных зьмен няма. Зноў — ніякіх разгорнутых матар'ялаў аб лісьце тав. Сталіна, аб барацьбе партыі супроць трацкісцкай прапаганды і гнілога лібералізму. Даволі ўказаць, што прамову тав. Кагановіча рэдакцыя «С. Б.» спаткала таксама поўным маўчаньнем. Яе яна не зьмяшчала да самых апошніх дзён.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК і партыйны друк БССР бязьлітасна выкрывалі канкрэтных носьбітаў трацкісцкай кантрабанды. Наша партыя сурова ўдарыла па гнілых лібералах, гандлёўшых скрозь пальцы, як Югавы і К°, працягвалі кантрабандай свае трацкісцкія і поўтрацкісцкія ідэйкі. Наша партыя дала руйнуючы адпор выступленьням ухілістаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізму тыпу Вальфсона і Выгры.

Аб усіх гэтых фактах «С. Б.» да 29 сьнежня не сказала ні слова. Толькі прызнаючы свае памылкі, адзначаныя ў «Зьвязьдзе», рэдакцыя мімаходам спынілася на лісьце тав. Сталіна:

> «Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю «Пролетарской революции» з усёй настойлівасьцю ставіць пытаньне аб узьняцьці пільнасьці, аб разгортваньні бязьлітаснай барацьбы з трацкісцкай кантрабандай як у тэорыі, так і на практыцы, аб узмацненьні барацьбы з усякімі праяўленьнямі гнілога лібералізму ў радах нашай партыі» («Савецкая Беларусь» ад 20-га сьнежня).

Трэба адзначыць, што ў дэкаду Камуністычнай акадэміі «С. Б.» зьмясьціла поўныя матар'ялы, у якіх у тэзіцы іншай ступені закраналася пытаньне аб барацьбе з трацкісцкай кантрабандай. Але гэта — НЕ ЗАСЛУГА ГАЗЭТЫ. Гэтыя матар'ялы ў большай ступені — афіцыяльныя справаздачы БелТА.

І толькі пасьля таго, як адбыўся сход менскага партактыву, які пабальшавіцку мабілізаваў усю партыйную арганізацыю на далейшую барацьбу з трацкісцкай кантрабандай і гнілым лібералізмам, рэдакцыя ўсхапянулася. 29 сьнежня «С. Б.» зьмясьціла перадавую, у якой, так сказаць, нарошце выкрывае ўжо выкрытых трацкісцкіх кантрабандыстаў і фальсыфікатараў — Югавых, і інш. Толькі цяпер «С. Б.» усхапянулася і апублікавала прамову тав. Кагановіча.

Аднак, і апошняя перадавая «С. Б.» ня ўнікла некаторых памылак. У ёй, напрыклад, зусім не падкрэсьлена актуальнасьць барацьбы з ідэалізацыяй люксамбургіянства на ўмовах КП(б)Б. Між іншым гэтай барацьбы газэта і па сёпешні дзень ня толькі не разгарнула, а нават і не ўспамінае пра яе.

Яшчэ больш грубая і шкодная памылка дапушчана рэдакцыяй і ў артыкуле «СУПРОЦЬ ТРАЦКІСЦКАЙ І БУНДАЎСКАЙ ФАЛЬСЫФІКАЦЫІ ГІСТОРЫІ КП(б)Б» («С. Б.» ад 30 сьнежня 1931 г.). У гэтым артыкуле адкрыта прапагандуецца да канца выкрытая тав. Сталіным ідэйка гнілых лібералаў шібы трацкізм «ёсьць фракцыя камунізму»:

> «За апошнія гады — піша «С. Б» — наша партыя гігацкі вырасла. У яе рады ўліліся новыя сілы, якія не прайшлі школы жорсткай барацьбы з капіталізмам і ўсякімі УХІЛАМІ АД ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ НАШАЙ ПАРТЫІ, ЯК ТРАЦКІЗМ, МЕНШАВІЗМ І Г. Д.» (падкрэсьленне намі Рэд.).

Меншавізм — авангард шкодніцтва і інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. З якога-ж гэта часу агенты контррэвалюцыі і сацыял - інтэрвэнты — меншавікі сталі ўсяго толькі «ухілістамі ад генэральнай лініі нашай партыі».

> «...трацкізм, — гаварыў тав. Сталін у сваім лісьце «АБ НЕКАТОРЫХ ПЫТАНЬНЯХ ГІСТОРЫІ БАЛЬШАВІЗМУ» — ёсьць перадавы атрад контррэвалюцыйнай буржуазіі, якая ведзе барацьбу супроць камунізму, супроць савецкай улады, супроць будаўніцтва сацыялізму ў СССР».

У рэдакцыі «С. Б.», як бачыце, зусім іншая думка. Газэта кваліфікуе трацкізм — перадавы атрад контррэвалюцыі, як «ухіл ад лініі партыі». Такія адносіны рэдакцыі да гэтых антыленінскіх установак зьяўляюцца махровым гнілым лібералізмам ў адносінах да контр-рэвалюцыйнага трацкізму і меншавізму.

Рэдакцыя «С. Б.» і да сёпешняга дня сваіх памылак не прызнала. І да сёпешняга дня рэдакцыя «С. Б.» маўчыць, што яна груба памылялася, калі на працягу доўгага часу ігнаравала ліст тав. Сталіна і не разгарнула рашучай барацьбы з канкрэтнымі носьбітамі трацкісцкай кантрабанды і гнілога лібералізму, калі яна адвесла контррэвалюцыйных трацкістаў і меншавікоў да «ухілістаў ад лініі партыі». А гэтыя памылкі даўно ўжо пара прызнаць, а на справе ВЫПРАВІЦЬ ІХ і разгарнуць самую суровую і непрымірымую барацьбу супроць усіх і ўсякіх зброеносцаў контр-рэвалюцыйнага трацкізму, супроць усіх і ўсякіх носьбітаў гнілога лібералізму.

РАБОЦЕ СТАЛОВАК — УВАГУ ГАСПАДАРНІКАЎ

Паравозныя і кандуктарскія брыгады павінны атрымліваць гарачую страву ў любы час дня і ночы

Завершыць перабудову работы транспартных сталовак

ОРША.

Перабудова работы транспартнай грамадзкага харчаваньня зьяўляецца сустаўной часткай агульнай барацьбы партыі за бальшавіцкую рэканструкцыю транспарту.

Каб павялічыць прабег паравозаў — зьменшыць прастоі іх, трэба таксама дадаць магчымасьць паравозьнікам атрымаць абед у самы кароткі тэрмін. Паравозныя брыгады неабходна забясьпечыць гарачай добраякаснай стравай круглыя суткі.

Ліквідацыя чаргі ў рабочых сталоўках, пашырэньне буфэтаў з вялікім выбарам халоднай стравы — усё гэта важныя задачы, якія стаяць перад транспартнай сэкцыяй грамадзкага харчаваньня.

Як аршанская сэкцыя спраўляецца з вырашэньнем гэтых задач?

Па вузьле ёсьць пэўныя дасягненьні ў арганізацыі грамадзкага харчаваньня. За пясьць месяцаў адкрыта некалькі сталовак, у тым ліку і сталоўка пяці з кругласутачным абслугоўваньнем паравозных брыгад і рабочых. Адкрыта сталоўка для кандуктарскіх брыгад, якая таксама адпускае абеды круглыя суткі.

Якасьць абедаў у транспартных сталоўках Оршы добрая. Ня менш 25 дзён у месяц гатуюцца мясныя абеды і вячэры з двух блюд. У некаторых сталоўках калёрыйнасьць абедаў далёка перавышае мінімальныя нормы. Напрыклад, сталоўка № 1 дае абеды 1.365 калёрый (нармальна 760), сталоўка № 15 — 750 калёрый, сталоўка № 16 — 728.

Да ліку дасягненьняў трэба аднесьці самазагатоўкі, якія па гэтых сталоўках займаюць значнае месца. Па сэкцыі самазагатоўкі перавысіла планавае паступленьне прадуктаў на 323,1 проц.

Сталоўкай № 1, напрыклад, за 25 дзён сьнежня загатоўлена ў вялікавым парадку мяса — 844 клгр., сала — 62,5 клгр., збою — 165,5 клгр. сьмятаны — 500 літраў і шмат іншых прадуктаў.

Адміністрацыя Аршанскага вузла не аказвае патрэбнай дапамогі ў рабоце сталовак.

Вось некалькі прыкладаў.

Сталоўка № 6. Ад марозу хутка стынуць абеды, ня ўцеплены сьцены і не адрамантаваны дах. Сэкцыя грамадзкага харчаваньня адпусьціла грошы на пабудову каналізацыі. Д. З. зрабіў гэта, але так, што каналізацыя ўжо замерзла.

НСР - 4 пабудаваў для сталовых на Оршы-Усходняй гарадзкавальніх, але так, што гарадзкавальнік праз дэкаду папоўніўся вадой, якая замерзла, а гарадзкая асушана.

Будаўніцтва фабрыкі-кухні пачата было быць скончана 1/1-32 г. На сёньня работы выкананы ня больш як на 40 проц.

Такіх фактаў шмат. Але і гэтых даволі для таго, каб патрабаваць ад гаспадарнікаў большай увагі і штодзённай дапамогі ў рабоце сталовак. Разам з тым трэба з большай энэргіяй узяцца за ліквідацыю тых недахопаў, якія тармозяць работу сталовак. У першую чаргу неабходна разгарнуць работу на ўкарэненьні зьдзельшчыны, гаспадарчага разрахунку і ўдасканаленьні бухгалтарскай сыстэмы.

Д. К.

Пашырыць вопыт сталоўкі № 3 ТСТ чыгуначнікаў

ТСТ Менскага вузла не забясьпечвала патрэбнага кіраўніцтва сваімі сталоўкамі, не перадае вопыт лепшых усім сталовым.

Дзве сталовыя ТСТ, адпольная забясьпечаныя прадуктамі і апаратам, паказваюць вялікую розьніцу ў арганізацыі харчаваньня.

Сталовая № 8. Маленькая цёмная заля. Сьцены пакрыты зялёнай цвілью, холадна. Тут харчуецца 150 чал. рабочых саўгасу ТСТ імя Фабрыцыуса і рабочыя апкормачнага пункту. Гэты саўгас заблытанае гарэтінай чыгуначнікаў і ўсе сталоўкі ТСТ.

Кухня гэтай сталоўкі цесная. Кладоўка тут-жа калі плёты за дапчатай перагародкай. У ёй цёпла і вільготна. Прадукты псуюцца.

Абед з трох блюд і ня нізкай калёрыйнасьці, але дрэнна тое, што пабліжэйшая сыстэма ня ўведзена. Загадчык тлумачыць гэта адсутнасьцю катлоў.

А вось сталовая № 3. У ёй харчуецца 750 фабзавучнікаў. Па чыстаце і арганізаванасьці ні адна студэнцкая сталоўка Менску не стаіць так высока, як сталоўка № 3.

У сталоўцы чыста, столькі засланы белай цыратай, няма тэй штуратэй, якая нагадваецца ў студэнцкіх гарадзкіх сталоўках.

Працуе бракеражная камісія, якая складаецца з аднаго кухара, аднаго з абедаючых і сэкрэтара. Агляд якасьці прадуктаў і абедаў робіцца амаль кожны дзень. Вопыт сталоўкі № 3 трэба перанесьці ва ўсе сталоўкі ня толькі ТСТ, але і гораду.

М. Д.

А. Р. Шэлін

„Не зважаючы ні на што"...

Польшча фашыстскай дыктатуры моцна зраслася з такімі азначэньнямі, як «турма народаў», як «краіна правакацый і тэрору», як краіна Луцку, Пінску і іншых крывавых засьценкаў, турмаў і дэфэнзываў. Да раду гэтых азначэньняў, якія выказываюць сутнасьць сыстэмы, што пануе ў Польшчы, прыбавілася яшчэ адно — «краіна шыбеніц».

Правялі толькі 4 месяцы пасьля таго, як напалоханы ростам рэвалюцыйнага руху ўрад Пілсудзкага ўвёў палявыя суды, а шыбеніцы сталі ўжо звычайным зьявішчам. «Звычайным» у тым сэнсе, што дзень за днём газэты паведамляюць аб палявых судох у розных кутках Польшчы, «звычайным» у тым сэнсе, што крывавая сыстэма сваволі песпа і хутка зраслася і з такой формай барацьбы супроць працоўных, як пакаранньне сьмерцю.

Лічэ не зараелі магілы сямі чыгуначнікаў, павешаных у Баранавічах, як гэтымі днямі ў Навагрудку павешан селянін Іракоп Маскаліч. Хутка інсэніруюцца палявыя суды на падставе ўсялякіх правакацыйных матар'ялаў і даных. Сьмяротныя прыгаворы выносяцца ў Вільні і на Валыні, ва Львове, Варшаве і Пазнані. Фашыстская прэса захлынаецца ад захапленьня і з дэталямі садыстаў апісвае выкананьне раду прыгаворох аб павешаньні. Сацыял-фашыстскія здрадзікі, падымаючы разам са сваімі гаспадарамі — кіруючым фашызмам — шум вакол берасьцейскага працэсу, маўчаць у сувязі з палявымі судамі і сьмяротнымі прыгаворамі, маўчаньнем іх зусім ад двузначна прыкрываюцца кляузную работу фашыстскай дыктатуры.

Шпарка працуе машына сьмерці, прабуючы затрымаць напор рэвалюцыйнай хвалі рабочай клясы і працоўных Польшчы. Усё новыя шыбеніцы пацурым лесам пакрываюць усю краіну. Мэта тут ясная — разграміць рух, забіць у масах волю і адвагу да барацьбы, фізічна зьнішчыць лепшыя авангардныя сілы пралетарыяту.

Гэта паліцыка шыбеніц і палявых судоў сьведчыць аб панічным страху фашыстскай дыктатуры перад ростам сіл рэвалюцыі. Шыбеніцы і палявыя суды — гэта ўжо ня «звычайныя» сродкі барацьбы, гэта ўжо жэтады, што мяжуюць з мэтадамі грамадзянскай вайны. Гэта сродкі ў абстаноўцы, калі ў краіне сапраўды разгараецца вялікі пажар рэвалюцыйнай барацьбы, пагражаючай самім падвалінам капіталістычнага панаваньня. Пустым самахвальствам бравых фашыцкіх палкоўнікаў зьяўляюцца іх заявы аб тым, што ў Польшчы «ўсё спакойна» і што палявыя суды — гэта пейская «пацка», якая павіна палохаць... кішэньных злодзеяў. Не — рост крызісу, рост камунізму ва ўсёй краіне — вось асноўнае ў ацэнцы ўнутранога становішча Польшчы. Боязьнь фашыцкай дыктатуры, што нарастаючыя сілы рэвалюцыі прарвуць ланцуг белага тэрору і пачнуць ламаць самы апарат фашыцкага прыгнечаньня, — вось што зьяўляецца асноўнай прычынай увядзеньня палявых судоў.

ЦК кампартыі Польшчы ў лістоўцы, выданай нагэт павешаньня 7 баранавіцкіх чыгуначнікаў, заявляе: «Павешаньне 7-мі — гэта найбольш яркі прыклад таго, якімі сродкамі фашыстскі ўрад Пілсудзкага хоча затрымаць нарастаючую пралетарскую рэвалюцыю, якімі сродкамі імкнецца ўтрымаць ён узрастаючыя хвалі нацыянальна - вызвалеўчага руху. «Павешаньне 7 чыгуначнікаў, — гаворыць адозва ЦК КПП, — гэта зьвяно ў падрыхтоўках фашызмам вайны супроць СССР».

Баранавічы — гэта так званыя «крэсы ўсходнія», там, дзе лютае асабліва яркая сваволя фашыстскіх акупантаў, там, дзе асабліва актыўна пачалі прамаваць палявыя суды.

А што робіцца ў цэнтры краіны, у сталіцы Польшчы — Варшаве? Пабывалае завастрэньне тэрору ў рабочых цэнтрах Польшчы пакідае далёка з-за ду ўсё, што ўмеюць дагэтуль фашысы. Разам з палявымі судамі ўсё часьцей і часьцей у Варшаве адбываюцца паліцэйскія налёты па цэлыя рабочыя кварталы, фабрыкі і заводы. Усё больш частым зьявішчам становіцца так званая «чорная карэтка», што раптам зьяўляецца ў рабочых кварталах Варшавы і арыштоўвае дзесяткі нерных трапіўшых пад рукі жыхароў горада. Такая карэтка звычайна прыяжджае разам з паліцыяй і агентамі дэфэнзывы. Вось што расказвае аб гэтым орган ЦК КПП «Чырвоны штандар» № 11 у карэспандэнцыі «Варшэн экспэдыцыі ў рабочай Варшаве»:

«У рабочых раёнах часта паяўляецца «чорная карэта», «буда», як яе завуць рабочыя. Вечар. На Грэнцкую вуліцу выязджае, хаваючыся за трамваем, грузавік. Пад брэзэнтавым пакрыцьцём некалькі людзей. Аўтамабіль спыняецца за рогам вуліцы. «Пасажыры» вылазяць і ідуць узлоўж тратуару. Нюхаюць. Знайшлі! Вароча ецца тры рабочыя з фабрыкі Нобліна. На іх галовах, тварах, руках, па сьпіне пачынаюць біць гумовымі палкамі, якія раптам выскачылі з рукавоў. Ручкай браўніна ў лоб... Крыкі жанчын, дзяцей, і вуліца пусьнее. Акрываўленыя рабочыя ўцякаюць, закрываючы разьбітыя галовы рукамі. Каты гоняцца далей, шукаюць новых ахвяр, шукаюць рабочых, шукаюць моладзь, якая адважваецца хадзіць не ў аліпочку. Пакуль не арыштуюць. Толькі зьбіваюць... У яўрэйскім квартале чорная карэта пачынае дзейнічаць паўльвячорку. Сьпіцца па Муранаўскім плацы і іншы раз ня рухаецца з месца па 6 гадзін. Калі па хочам пазнаёміцца з дэфэнзыўскімі бандытамі, дык ня ідзі праз плац і яго акраіны...

... У дзень апублікаваньня загаду аб палявых судох, пад кіраўніцтвам шэфа бясьпечнасьці Варшавы — камісара Лісоўскага, адбыўся напаў на яўрэйскі раён. У саюзе пекараў яшчэ сьветла. У памяшканьні некалькі дзесяткаў людзей. Ідзе шумная гутарка: атака працярыемцаў на заработную плату, рэдукцыі і г. д. Раптам... рэвальвэры ляцяць за дзьвярыма. У дзьверы ўвальваецца патоўп паліцэйскіх агентаў і зноў заля ў столь. Як чортаў ілыш, захадзілі рукі, узброеныя рэвальвэрамі і штыхамі. Зьвіняць выбітыя шыбы, гасьне сьвятло і ў цемнаце чутны толькі нарэўнамерныя, хуткія, глухія ўдары і енкі параненых. Паранцце, усё сьціхла. Паліцыя вышла. З нарога, п. камісар, выходзячы, кідае: «мы яшчэ сюды вернемся!».

Вось асобныя малюнкі тых звычаяў, якія ўводзяцца ў цэнтры краіны, у сталіцы дзяржавы, якая асабліва задаецца і посьцца сваёй «місіяй цывілізаванага авангарду» на ўсходніх рубяжох Эўропы.

Важна цяпер задаць пытаньне — ці ўдалося фашыцкай дыктатуры ўвядзеньнем палявых судоў, дзесяткамі сьмяротных прыгаворох, увядзеньнем усялякіх новых мэтадаў і сродкаў барацьбы супроць рабочага руху, ці ўдалося ёй дэзарганізаваць рух, унесьці паніку, прымусіць да адступленьня і г. д.? Ці ўдалося машына сьмерці стварыць такую атмасфэру страху, якая-б асабліва сілы і волю пралетарыяту? На гэта пытаньне падзеі далі і кожны дзень даюць ясны і рашучы адказ — гэтага фашызму зрабіць не ўдалося!

Возьмем факты апошняга часу.

Пасьля ўвядзеньня палявых судоў Варшава была ахоплена другой забастоўнай трамвайчыкаў, якая паказала прыклад пябывалага рэвалюцыйнага гераізму, адвагі і рашучасьці варшаўскіх пралетараў. Забастоўка варшаўскіх трамвайчыкаў, якая адбывалася пад кіраўніцтвам прафсаюзнай лявіцы і варшаўскай арганізацыі КПП, адрозьнівалася выключнай вострасьцю і выключным баявым энтузіязмам бастуючых рабочых.

Ня глядзячы на палявыя суды, ня глядзячы на павешаньне дзесяткаў людзей, на працягу вось ужо амаль 3-х месяцаў адбываецца ў Лодзі шматтысячная забастоўка рабочых шоўка-прадзільнай і трыкатажнай прамысловасьці. Гэта забастоўка, аб якой, на жаль, па старонкі нашай прэсы трапілі вельмі скромныя весткі, прадстаўляе сабой пісьмэнны ўзор упартай барацьбы рабочых у самых цяжкіх умовах сацыял-фашыстскага здрадніцтва і скапцэнтраванага тэрору ўсяго фашыстскага лягеру. У той час, як кожнае слова ў абарону СССР абвяшчаецца «тэяржаўнай здрадай», калі на шыбеніцах гіне 7 рабочых-чыгуначнікаў таму, што яны змагаліся супроць ваенных замыслаў польскага імпэрыялізму, у Лодзінскай забастоўцы адбываецца такі надзвычай характэрны факт: па сходах бастуючых НПСТаўскія здрадзікі ўносяць прапанову зьвярнуцца да Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу з просьбай аб дапамозе. Абураныя рабочыя адкідаюць гэту прапанову в крыкамі: «Прэч агентаў буржуазіі, к чорту Амстэрдам, няхай жыве Масква». І сход аднагалосна прымае рэзалюцыю прывітаньня рабочым Савецкага Саюзу, у прыватнасьці, тэкстыльным рабочым і заклікае іх аказаць рэвалюцыйную дапамогу бастуючым. На шматлікіх сходах бастуючых, якія іншы раз па свайм складзе дасягаюць 6.000 чал., прымаюцца рэзалюцыі пратэстаў супроць увядзеньня палявых судоў, у абарону палітычных зьняволеных.

Пасьля ўвядзеньня палявых судоў у Вільні адбывалася аднагадзінная забастоўка чыгуначных майстэрань у знак пратэсту супроць рэдукцыі, якая сьведчыць аб тым, што чыгуначнікі Вільні пачынаюць наперакор тэрору і сацыял-фашыстскаму апэтыту станавіцца на актыўную абарону сваіх інтарэсаў.

Ня глядзячы на палявыя суды, у дзень 7-га л

ІНДЫЯ Ў АГНІ СЯЛЯНСКІХ ПАЎСТАНЬНЯЎ

СТАН АБЛОГІ У БЭНГАЛІІ І ЗЛУЧАНЫХ ПРАВІНЦЫЯХ

ЛЕНДАН, 4. Арыштаваныя ў Бамбэі брытанскімі ўладамі лідэры кангрэсу **Гандзі і Патэль** адпраўлены ў Пуну (бліз Бамбэя). Па думцы друку, ні ўрад Індыі, ні Гандзі не чакалі такога шпаркага разьвіцьця, «канфлікту» між уладамі і кангрэсам. Аднак, **шпаркае разгортваньне рэвалюцыйных падзей у Індыі** прымусіла абодва бакі пасторыць разьвязку.

Кансэрватыўны друк ухваляе арышт Гандзі і дамагаецца яшчэ большага пашырэньня палітыкі «цьвёрдай рукі». Меншэвы (лідэр парляманцкай фракцыі лейбарыстаў) няпэўна заявіў, што становішча ў Індыі павінна быць санкцыянавана, калі віцэ-кароль прымушан быў скарыстаць сваю ўладу настолькі шырока. Тым часам у паўночную частку Мадраскай правінцыі, дзе, як паведамляюць газэты, «шпарка распаўсюджваецца сялянскі рух няўплаты падаткаў», адпраўлены буйныя ваенныя сілы. У паўночна-заходняй пагранічнай правінцыі адбываюцца сутычкі з чырвонарубашачнікамі. У гэтай правінцыі паводле распараджэньня галоўнага ангельскага камісара абвешчана нелегальнай абмасная «джырга» аўганскіх плямён. Пры вобысках у некаторых мясцовых адзяленьнях гэтай арганізацыі войскі і паліцыя знаходзілі вінтоўкі.

Амаль ва ўсіх правінцыях Індыі таксама абвешчаны незаконнымі арганізацыі індыйскага нацыянальна-рэвалюцыйнага саюзу моладзі «Наўджаван бхэрат сабхад» і рэвалюцыйныя арганізацыі сялянства і пралетарыяту. Сярод гэтых арганізацый праводзяцца масавыя арышты і вобыскі. На аснове выданых віцэ-каралём надзвычайных загадаў, якія ўводзяць стан аблогі ў Бэнгаліі і ў Злучаных правінцыях. У паўночна-захоўнай правінцыі дзейнічаюць надзвычайныя трыбуналы. Урадавыя ўстановы ахоўваюцца ўзмоцненымі атрадамі паліцыі. Ангельскія чыноўнікі нават у гарадох зьяўляюцца па вуліцах толькі ў суправаджэньні ўзброенай аховы.

Ангельскі імпэрыялізм узмацняе тэрор

ЛЕНДАН, 4. Паводле паведамленьня з Бамбэю, у індускіх кварталах горада ў знак пратэсту супроць арышту Гандзі захоўваецца хартал (дэманстрацыйнае спыненьне работ і гандлю). 14 фабрык не працуюць. На біржах здзелкі не заключаюцца. Віцэ-кароль апублікаваў дэкрэт, які **прадстаўляе надзвычайныя паўнамоцтвы ўладам.** Дэкрэт мае ў сабе настановы супроць друку, «незаконнага палбухтарваньня», «незаконных таварыстваў», супроць байкотаў і г. д. і прадугледжвае больш жорсткія рэпрэсіі, чым дэкрэты, выданыя ў 1930 годзе ў момант найбольш шырокай кампаніі «грамадзянскага непаслухмянства». Урад мае права неаткладна абвяшчаць па-за законам арганізацыі кангрэсу па ўсёй краіне. Кіраўнікі кангрэсу ў вялікай ступені прадбачылі гэтыя меры ўраду.

Вялізарнае абурэньне ў мусумальманскіх колах

ЛЕНДАН, 4. Як паведамляюць з Індыі, рэпрэсіі ўраду выклікалі моцнае абурэньне таксама ў мусульманскіх колах і прывялі да расколу сярод удзельнікаў Усеіндыйскай мусульманскай канфэрэнцыі, якая засядала ў Дэлі. Старшыня канфэрэнцыі і сакратар адмовіліся ад сваіх пастоў, паказваючы, што мусульманам павінна быць дана поўная магчымасьць далучыцца да руху кангрэсу. «Рабочы Камітэт» канфэрэнцыі выпес рэзалюцыю, у якой заяўляе, што надзвычайны ўказ і масавыя арышты ў паўночна-заходняй правінцыі адхіляюць думку аб магчымасьці якога-б там ні было супрацоўніцтва паміж мусульманамі і ўрадам. Двум сябрам камітэту даручана абсьледваць становішча ў пагранічнай правінцыі і далажыць камітэту.

У краіне ваенна-пялявых судоў і шыбеніц

300 млн. злотых--падагунак для капіталістаў

ВАРШАВА, 4. У міністэрстве працы адбудзецца 7 студзеня канфэрэнцыя прадстаўнікоў ураду з прадстаўнікамі саюзу прадпрыемцаў па пытаньні аб устанаўленьні мараторыя для затрыманых прадпрыемцамі ўзносаў у больнічныя касы і іншыя ўстановы сацыяльнага забесьпячэньня, а таксама аб зьніжэньні гэтых узносаў у будучым і наогул аб перагляндзе санзакладаўства ў бок рэзкага пагоршаньня. Паводле вестак газэт, затрыманыя капіталістамі ўзносы дасягнулі ўжо 300 млн. злотых. Мараторы будзе абвешчан па меншай меры на тры гады. Фактычна-ж няўплачаныя ўзносы павінны застацца наогул у кішэнях прадпрыемцаў. Памешчыкі ўжо цэлы год карыстаюцца такім мараторыям.

Рабочыя Лодзі рыхтуюцца да ўсеагульнай забастоўкі

ВАРШАВА, 4. У Лодзі рабочыя надзвычай абураны тым, што прафсаюзныя згодніки запягаюць перагаворы з прадпрыемцамі, якія сарвалі калдагавор і зьнізілі зарплату. Рабочыя масы, пад кіраўніцтвам прафсаюзнай левай, рыхтуюцца да ўсеагульнай забастоўкі. У Верхняй Сілезіі на буйнай капальні «Мэкс», дзе працуе каля 1.500 рабочых, прафсаюзная апазыцыя, якая ня мела ніводнага мандата ў заўкоме, алявала ў сацыял-фашыстаў тры мандаты з шэсьці.

Сяляне Заходняй Беларусі руйнуюць палёнізатарскія школы

ВІЛЬНЯ, 4. Барацьба рабоча-сялянскіх мас Заходняй Беларусі супроць палёнізатарскай палітыкі акупантаў набывае з кожным днём усё больш вострыя формы. Рабочыя і сяляне ня толькі байкатуюць палёнізатарскія школы, ня толькі праганяюць настаўнікаў, якія ў большасьці сваёй зьяўляюцца простымі агентамі дэфэнзывы,—а ў апошні час руйнуюць гэтыя гнёзды палёнізацыі.

Учарайшы «Кур'ер Віленскі» паведамляе, што ў **вёсцы Геранцы** (Віленшчына) сялянская моладзь разграміла мясцовую польскую школу, пры гэтым зьнішчаны партэты дзяржаўных дзеячоў, а таксама дзяржаўны герб.

Паліцыя вядзе «энэргічнае сьледзтва».

Яшчэ адна ахвяра дэфэнзывы

ВАРШАВА, 4. У Тарнопалі загінуў пры таямнічых умовах палітзьняволены, асоба якога не ўстаноўлена. Згодна паліцэйскага рапарту, арыштаваны прабаваў уцячы з паліцэйскага вучастку ў часе допыту. Пераканаўшыся, аднак, што ўцячы немагчыма, палітзьняволены, нібы, сам перарэзаў сабе горла выхапленай з кішэні брытвай. Некаторыя газэты задаюць пытаньне — адкуль у арыштаванага ў кішэні брытва?

95 проц. усіх шаўцоў Вільні --беспрацоўныя

ВІЛЬНЯ, 4. «Дзеньнік Віленскі» зьмяшчае даныя адносна далейшага паглыбленьня эканамічнага крызісу ў Зах. Беларусі. Паводле гэтых даных, у Вільні за адзін толькі сьнескань мінулага году **збанкрутавала 100 гандлёвых прадпрыемстваў.**

Лічба беспрацоўных у Вільні шпарка расьце. Яна, цяпер, паводле ўрадавых даных, дасягае **5.115**, што ў параўнаньні з мінулым тыднем дае рост на 100 асоб.

Цікава-таксама і тое, што **95 проц. агульнага ліку шаўцоў у Вільні беспрацоўныя.**

Эканамічнае жыцьцё гораду замерла амаль зусім.

Масавыя арышты ў Варшаве

ВАРШАВА, 4. У ноч на новы год ў Варшаве зроблены жандармэрыяй масавыя вобыскі. Згодна афіцыяльнага паведамленьня, арыштаваны ўдзельнікі двух камуністычных сходаў, якія, нібы, абмяркоўвалі плян выступленьня ў дзень новага году.

Першая акруговая парткафэрэнцыя пагранаховы і войск АДПУ БССР

Учора ў Менску адкрылася першая акруговая партыйная канфэрэнцыя пагранаховы і войск АДПУ БССР. Канфэрэнцыю адкрыў уступнай прамовай, прысьвечанай сучаснай міжнароднай абстаноўцы, умовам і задачам сацыялістычнага будаўніцтва — начальнік Упраўленьня Пагранічнай Аховы і войск АДПУ — таз. **Чарнабыльскі.**

На парадку дня канфэрэнцыі: 1) палітычны даклад ЦК КП(б)Б, 2) чарговыя задачы партыйна-палітычнай работы ў пагранаховае і вайсках ДПУ Акругі, 3) выбары акруговай партыйнай камісіі, 4) выбары на армейскую акруговую парткапфэрэнцыю.

У гапаровы прэзыдыум абраны **члены Палітбюро ЦК УсеКП(б)** і члены калегіі АДПУ СССР.

Прэзыдыум канфэрэнцыі абран у складзе 35 чалавек. Сярод абраных т. т. **Гей, Галадзед, Шаранговіч, Чарвякоў, Рашаль, Быстрых, Убярэвіч, Калнін, Аранштам, Рыжоў, Гантман, Ракасоўскі, Матсон, Дукельскі, Чарнабыльскі, Раманенка, Стабін, Наумаў** і інш.

Канфэрэнцыю віталі начальнік Палітаддзелу ГУПА і ВАДПУ СССР тав. **Рашаль**, ад імя ЦК КП(б)Б— т. **Гантман**, начальнік ПУ БВА — тав. **Аранштам**; рабочыя падшэфнай гуты «**Пралетары**», дэлегацыя хэмфарызаводу, міліцыі і інш.

Па СССР і БССР

Спартыўныя рабочыя арганізацыі Захаду едуць у СССР

МАСКВА. У студзені ў СССР прыяжджаюць нарвэская і швэдзкая спартыўныя каманды лыжнікаў, канькабежцаў. Выступленьні гасьцей адбудуцца ў Ленінградзе, Казані, Сьвярдлоўску і ў Маскве на рэспубліканскім зімовым сьвяце фізкультуры. У СССР прыяжджаюць таксама швэдзкія, дацкія, германскія спартсмэны, якія зробяць паездку па Украіне і Закаўказьзі.

Першы ўсесаюзны зьезд Аўтадору

5 студзеня ў Цэнтральным Доме Чырвонай арміі адкрываецца першы ўсесаюзны зьезд Аўтадору. На зьезьдзе будуць заслуханы наступныя даклады:

«Вынікі работы і задачы Аўтадору ў новых умовах», «Вынікі і пэрспэктывы аўтатрактарнага будаўніцтва» і «Вынікі і чарговыя задачы ў галіне дарожнага будаўніцтва і эксплёатацыі аўтапарку». На зьезьдзе будзе зацьверджан статут саюзу Аўтадору СССР і адбудуцца выбары кіруючых органаў усесаюзнага Аўтадору.

Да пачатку сэзону ДЯТ БССР у Менску

Пасьля двухгадовых гастроляў па Украіне, РСФСР і Беларусі, у Менск вярнуўся на пастаянную базу Дзяржаўны Лўрэйскі тэатр БССР. Тэатр пачне свае гастролі 10 студзеня ў памяшканьні кіно «Культура», якое зараз спэцыяльна пераабсталёўваецца пад тэатр.

Сэзон адкрыецца пастаноўкай украінскага пралетарскага драматурга А. Карпейчука «Штурм».

За пэрыяд сваіх гастроляў тэатр падрыхтаваў 4 новых пастаноўкі: «Стрэл» — Бязыменскага, «Па 62-м вучастку» — Дабрушына, «Паэма аб сякеры» — Пагодзіна і «Штурм» — Карпейчука.

Тэатр прабудзе ў Менску да 15 мая г. г., а потым паедзе па двухмесячныя гастролі.

Пры тэатры арганізавана студыя з 20 чалавек, якая набрана з рабочых прадпрыемстваў Украіны і Беларусі. Усе студыйцы—камсамольцы.

Паведамленьні

7 СТУДЗЕНЯ, У 19 ГАДЗ., У ПАМЯШК. ДОМУ ПІСЬМЕНЬНІКА АДБУДЗЕЦЦА ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ БЕЛЛАЧАФ. ПРЫСУТНАСЬЦЬ УСІХ ЧЛЕНАЎ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА У МЕНСКУ, АБАВЯЗКОВА.

— 6-1—32 г., у 6 гадз. веч., у памяшк. аб'яднага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ БССР (Савецкая, 55, 1-шы паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ з разглядам наступных спраў: 1) Справа Стырпо аб выключэньні яго з Горацкай с.-г. акадэміі. 2) Справа архітэкт.-будаўнічага тэхнікуму. 3) Справа сэктару кадраў НКФ. 4) Справа кандуктара трамваю т. Сыцінавай аб грубых адносінах да пасажыраў. 5) Справа агранома Кардамона аб зьнятьці яго з працы ў Смалявіцкай МТС. 6) Справа Белгандлю аб няправільным прыняцьці на працу бухгальтара садова-гародняй базы МЦРК. 7) Справа б. замяўпарадкаваньня Васлаўскага рабну т. Позьняка. 8) Вынікі праверкі разгаданьня Пухавіцкім раёнам на заявы насельніцтва і г. д. 9) Вынікі расьсьледваньня заявы аб няправільным звароце маемасьці ў Якшыцкім с.-с. Бярэзінскага раёну. 10) Вынікі на праверцы выкананьня пастаноў БС. 11) Справа 9 ЖАКГу т. Кацмана. Усе т. т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засядацелі: Янчук, Бурак, Баўрук і Цытрон (Хлебазавод), Гутман, Гельфанд, Жыжэнскі, Сьлесар, Бацэўнік, Жук, Кузьміна, Быхлін, Крэмэр, Казатонская (абутк. ф-ка).

— Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б. Арг.-інстр. адда. ЦК КП(б)Б паведамляе, што курсы райпартактыву пачнуць працаваць 10 студзеня. Мандатная камісія пачынаюць працаваць з 10 студзеня, у 9 гадз. раніцы, у г. Менску (Рэвалюцыйная, № 6). Прапануецца ўсім гаркомам і райкомам КП(б)Б забясьпечыць сакрэтарскую яўку курсантаў на курсы райпартактыву.

Інстытут маскоўнага завочнага навучаньня пры ЦК КП(б)Б

РАСКЛАД РАДЫЁ-ПЕРАДАЧ НА СТУДЗЕНЬ 1932 г.

Завочна-Камуністычны унівэрсытэт

16—1—Крытыка антымарксыцкіх тэорый грошай.

26—1—Прырода і роля грошай у пераходны пэрыяд у СССР.

11—1—Мэтодыка самастойнай працы (як складаць раб. запіс).

21—1—Гісторыя клясавай барацьбы (уводная лекцыя да курсу).

31—1—Буржуазная рэвалюцыя на Захадзе.

6—1—Бягучая палітыка: «Захоп Японіяй Манчжурыі і падрыхтоўка імпэрыялістычнай вайны супроць Савецкага Саюзу».

Завочна-камсамольскі ун-т і завочная СПШ

12—1—Гісторыя клясавай барацьбы і вялікая француская рэвалюцыя.

17—1—Мэтодыка самастойнай працы.

7—1—Засуха і барацьба з ёю.

Радыё-курсы партыйнага актыву.

5—1—Задачы радыё-курсаў партактыву.

20—1—Дзьво сыстэмы: капіталізм і сацыялізм.

30—1—Характарыстыка капіталістычнага спосабу вытворчасьці.

10—1—Ліст тав. Сталіна і задачы марксыцка-ленінскага выхаваньня.

15—1—Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР і СССР на 1932 год.

25—1—Задачы партбудаўніцтва на сучасным этапе.

Эпізадычныя лекцыі.

1—1—Аб задачах асноўнага ваеннага перавозак транспарту.

2—1—Аб перабудове зарплаты.

4—1—Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

14—1—Барацьба міжнароднага пралетарыяту і рэвалюцыйнага сялянства за рэвалюцыйны выхад з крызісу.

19—1—Праблема пераразьмеркаваньня рабочай сілы.

22—1—8 год бяз Леніна, на ленінскім шляху.

24—1—Барацьба за гаспадарчы разрахунак на сучасным этапе.

9—1—Барацьба за ленінскі этап філёзофіі.

27—1—Ліст тав. Сталіна і задача культурна-нацыянальнага будаўніцтва ў БССР.

29—1—Вынікі—14му зьезду КП(б)Н.

Дырэктар ІМЗО пры ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

РЫХТУЙЦЕСЬ ДА 4-га ПЛЕНУМУ ЦК МОПР'у БССР.

На 25-28 студзеня 1932 г. у г. Віцебску

— СКЛІКАЕЦЦА —

4-ы пашыраны пленум ЦК МОПР'у БССР

з наступным парадкам дня:

1) Даклад ЦК МОПР'у аб выніках праведзенай работы ўдзелу ў гаспадарча-палітычных кампаніях у 1931 г. і чарговыя задачы МОПР'у (дакл. т. Цудзін).

Судакład аб выніках выкананьня фінпляну за 1931 г. і чацьвярэньне фінпляну на 1932 г. (даклад т. Ленін).

2) Даклад Наркамзему БССР аб задачах МОПР'у ў 3-й большавіцкай весьне (дакл. т. Матус).

3) Справаздача Гомельскага ГК МОПР'у аб выніках праведзенай работы на буйных прадпрыемствах (дакл. т. Мулярэвіч).

Судакład заўкому МОПР'у зав. „Пралетары" (Гомель) (даклад т. Плотнік).

4) Справаздача Віцебскага ГК МОПР'у, аб выніках праведзенай работы ў сацыялістычным сэктары вёскі. (Дакл. т. Ораніштэйн).

Судакład ячэйкі МОПР'у першамайскага калгасу (Віцебск раён), даклад т. Катковская).

5) Аб перанымаючай кампаніі нізавых органаў МОПР'у. (дакл. т. Іткін).

На пленум запрашаюцца, акрамя ўсіх членаў і канд. ЦК МОПР'у і рэвізійнай камісіі, таксама ўсе сакратары ГК і РК МОПР'у, старшыні рэвізійных камісій Менскага, Гомельскага, Віцебскага, Магілеўскага і Аршанскага ГК—РК МОПР'у, а таксама старшыні заўкомаў МОПР'у наступных прадпрыемстваў: ад Менску—ф-ка „Кастрычнік", завод „Бальшавік", завод „Полымя Рэвалюцыі"; ад Гомеля—зав. „Пралетары", Палесдрук і завод імя Ланцункага; ад Віцебску—ф-ка „Сьвяг Індустрыялізацыі", ф-ка „Дзьвіна", зав. „Чырвоны Мэталіст"; ад Магілёва—зав. імя Сталіна і шоўкавая ф-ка; ад Воршы—Сталінбуд, Лесакомбінат; ад Мазыру—ф-ка „Чырвоны Кастрычнік", ад Барысава—ф-ка „Пралетарскае Перачэнне", зав. імя Дзержынскага, ад Бабруйску—Дрэваапрацоўчы камбінат; ад Рэчыцы—ф-ка „О кастрычніка".

Усім членам і кандыдатам ЦК МОПР'у, сакратарам ГК РК МОПР'у і запрашаным старшыням рэв. камісій і заўкомаў МОПР'у разасланы персанальныя запрашэньні праз ГК—РК МОПР'у, а таксама парадак выезду і аплаты выдаткаў удзельнікам пленуму.

Усе ГК і РК МОПР'у а таксама заводзкія арганізацыі МОПР'у, якія запрошаныя на пленум, павінны ўжо неадкладна разгарнуць падрыхтоўчую работу да пленуму, правесьці і палепшыць работу МОПР'у на ўсіх галінах, шляхам самаспаборніцтва, каб рапартаваць пленуму аб сваіх дасягненьнях.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў ЦК МОПР'у і ўсіх запрошаных на пленум абавязкова.

Адказны сакратар ЦК МОПР'у БССР ЦУДЗІН.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".

Ад сэрады 6 студзеня

ЗЯМЛЯ ПРАГНЕ

кіно-п'еса ў 6 частках.

Рэжысэр Ю. РАЙЗМАН.

У ГАЛ. РОЛЯХ: Кіра Андрэенкова, Н. Санаў С. Сьлётаў, Ю. Вінаградаў.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: ГУКАВЫ ФІЛЬМ у 1 частцы

ПЕСЬНЯ АБ КАЗАКСТАНЕ.

ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ:

ПАЧАТАК у 6, 7-30, 9 і 10-30, | | КАСА—ад 1 гадз.

Дзеці ў кіно не дапускаюцца. | | Пасьля 9-га звання ўваход забараняецца.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".

СЕКЬКЯ І ШТОДЗЕННА

РЫЧАРД ДЫКС

у амэрыканскім настаўным фільме

НАВАЛЬНІЦА Ў КАЛІФОРНІІ

(1000 нонокіх сіл).

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—кіно-хроніка САЮЗКІНО.

Пачатак сэансаў—у 2 г., 3-30, 6, 7-30, 9 і 10-30.

КАСА—адкрыта з 12 гадз. дня.

КУЛЬТУРА Пач. 7, 8-40, 10 30 — Новы настаўскі японскі фільм Што зрабіла яе гэткай Замыл. прагр. камэдыя ў 2 ч. БЯССТРАШНЫ БЭН.

ПРАЛЕТАРЫ Каса—ад 12 г. д. — СЬМЯРОТНЫ НУМАР драма ў 6 час. ПРАВАЛЬНЯ—фільм у 1 ч.

„Юны Піянэр" (будзьмен кіно „Культура") — Эпізод з грамадз. вайны Палац і цытадэля у 10 ч. Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. рэн.

„СПАРТАК" Пач. 6, 7-30, 9 і 10 45. Каса—ад 5. — Выданы фільм КРЫЖ І МАУЗЭР трагэдыя ў 8 частках.

АРЦЕЛЬ „ЧЫРВОНЫ ЛАЕЧНІК"

паведамляе, што з 1 студзеня 1932 г. адкрылася

МАЙСТЭРНЯ ПА РАМОНЦЕ ШОРНАЙ ЗБРОІ

Адрас: 3-я Декэрта № 13, тэл. 12—96.

Клюб ХАРЧАВІКОУ.

7 студзеня—зноўнай спэктакль у г. Менску. 3-га Беларускага тэатру пад кіраўніцтвам народнага артыста БССР ГАЛУБКА.

В. Сташэўскі.

ВІХОР пэса ў 4-х актах.

Білеты па заўкомах. Астача білетаў прадаецца ў касе клюбу з 5 гадз. вечара.

— Пачатак роўна ў 9 гадз. —

З 10 па 14 студзеня 1932 году адбудзецца 2-я ўсебеларуская канфэрэнцыя па барацьбе з сухотамі.

Адкрыцьцё канфэрэнцыі 10-га студзеня ў 5 гадзін вечара, у памяшканьні аўдыторыі Сухотнага інстытуту (інтэрнацыянальная вул. 21.)

Па справах аб інтэрнату для хаце агаў і атрыманьня кандататаў зьвяртацца ў канцылярыю сухотнага інстытуту (інтэрнацыянальная № 21) 10-1 з 9 г. дня ежэдзённа.

Выдавецтва „Зьвязда" просіць іншагародніх падпісчыкаў,

пры падпісцы на газэты „Зьвязда", „Орэя", „Раўд. Артаёс", „Рабселькор" ча сопс „Бальшавік Беларус" „Бел. Работніца і Калгасьніца",

не пасылаць у адрас выдавецтва грашовых пераводаў, а здаваць падпіску і грошы ў свае бліжэйшае паштовае аддзяленьне, што забясьпечвае акуратную дастаўку выданьняў.

Камуністычны Унівэрсытэт імя Леніна

абвяшчае

новы ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ

на польскую і яўрэйскую сэкцыі газэтнага аддзяленьня па наступным разьвярстцы:

НАЗВА РАЁНУ	Польск. сэктар.	Яўр. сэктар.	НАЗВА РАЁНУ	Пол. сэктар.	Яўр. сэктар.
1. Менскі	2	4	13. Плешчаніцкі	1	—
2. Віцебскі	2	4	14. Рэчыцкі	1	1
3. Гомельскі	2	4	15. Слуцкі	1	1
4. Бабруйскі	2	2	16. Шклоўскі	1	1
5. Магілеўскі	1	3	17. Крычаўскі	2	—
6. Полацкі	1	1	18. Дрысьвяцкі	1	—
7. Мазырскі	1	1	19. Жлобінскі	1	—
8. Аршанскі	1	1	20. Чэрвеньскі	—	1
9. Койданаўскі	2	—	21. Быхаўскі	—	1
10. Лепельскі	1	—	22. Дуброўенскі	—	1
11. Капыльскі	1	—	23. Кіраўскі	—	1
12. Барысаўскі	2	2	24. Чашніцкі	—	1

Усяго—26 польск.—30 яўрэйск.

Падача анкет да 20 студзеня 1932 г.

Прыёмны прыказ ад 6-XI—31 г. (газэта „ЗЬВЯЗДА" № 150) застаецца ў сіле і будуць часьцяны вышэйпаказаным РК КП(б)Б.

Загадчык Культпропам Чарнушэвіч.

Рэктар Камвузу Сеовіч.

Р. РАСТОЎСКАЯ

Фабзавуч, як асноўная форма падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых

XVI-ы зьезд УсеКП(б) акрэсьліў рою ФЗВ, як асноўную форму падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых для сацыялістычнай прамысловасьці.

Выходзячы з гэтай асноўнай устаноўкі, прамысловасьць ВСНГБ за апошнія два гады абрасла сеткай фабзавучаў, якія рыхтуюць кваліфікаваныя кадры для розных галін прамысловасьці.

Рост школ характарызуецца наступнымі лічбамі: на 1/1 1930 г. у сыстэме прамысловасьці ВСНГБ было 3 школы з кантынгентам 280 слухачоў; на 1/1 31 г. налічваўся ўжо 21 фабзавуч з 3.454 слухачамі; зараз ёсьць 25 школ з 8.230 чал.

З гэтых даных відаць, што 1930 г. быў пэрыядам разгортваньня сеткі фабзавучаў, а 1931 г. характарызуецца значным узбуйненьнем і ўмацаваньнем іх.

Выпускі з фабзавучаў у 1933 г. пакрыюць 43,3% патрэбнасьці ў кваліфікаваных кадрах для рэспубліканскай прамысловасьці замест 6,7 проц. у 1931 г.

Фабзавучы прабівалі сабе шлях у барацьбе з апартуністычнай недаацэнкай ролі гэтай асноўнай формы падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы.

Разважаньні аб тым, што быццам кваліфікаванага рабочага можна падрыхтаваць за 2-3 месяцы, што задача гаспадарчых арганізацый—даць толькі пэўную суму вытворчых навыкаў, усё-ж іншае (агульна-асьветная, палітэхнічная падрыхтоўка) павінна даваць школай сацыяльку. Усе гэтыя разважаньні год-два назад мелі даволі шырокае месца сярод часткі гаспадарнікаў.

Падобнага роду няправільныя погляды былі выкрыты, і ў сучасны момант яны не зьяўляюцца ўжо характарныя.

Органамі прамысловасьці ў асноўным узята роля фабзавучу, як школы, рыхтуючай кваліфікаваныя кадры рабочых, якія павінны быць ня толькі выканаўцамі сваёй вытворчай функцыі, але і арганізатарамі вытворчасьці, праваднікамі новых сацыялістычных форм арганізацыі працы, якія ўладаюць даволі глыбокімі спэцыяльна-тэхнічнымі і эканамічнымі ведамі і шырокім грамадзка-палітычным кругавідам.

Барацьба за правільнае плянаваньне падрыхтоўкі кадраў і за якасьць гэтай падрыхтоўкі—асноўная задача, на якую павінна быць накіравана ўвага партыйных, гаспадарчых, прафсаюзных арганізацый і самых школ.

Дагэтуль плянаваньне падрыхтоўкі рабочых кадраў у БССР на было заснавана правільна ўгрунтавана з пункту гледжаньня запатрабаваньняў нашай прамысловасьці. Рост школ ФЗВ праходзіў пярэдка па-за залежнасьцю з разьвіцьцём тых ці іншых галін прамысловасьці і асобных прадпрыемстваў.

У выніку гэтага ёсьць такія факты, што некаторыя буйнейшыя нашы прадпрыемствы («Камунар», «Бальшавік» і інш.) ня маюць фабзавучаў і, наадварот, фабзавучы існуюць на такіх прадпрыемствах, як завод «Ударнік» (Менск), «Рухавік рэвалюцыі» (Гомель), якія будуць у бліжэйшы час патрабаваць вельмі мала кваліфікаваных рабочых.

Вялізарным прабелам у плянаваньні зьяўляецца невыкананьне дырэктыў партыі ў адносінах новых пабудоў. Фабзавуч на новабудоўлі павінен быць арганізован раней, чым пускаецца ў ход данае прадпрыемства.

Нельга лічыць нармальным становіча, калі такое буйное прадпрыемства ва ўмовах БССР, як Гомсельмаш, ня мае фабзавучу і рыхтуе кваліфікаваных рабочых праз кароткатэрміновыя курсы. У тым-жа Гомелі ў пачатку 1932 г. павінна быць пушчана буйнейшая гута, а будаўніцтва ФЗВ пры ім яшчэ не распачата.

Пярэдкі выпадкі, калі гаспадарчыя аб'яднаньні глядзяць на вытворчую работу вучняў толькі пад кутом выкананьня прамфінпляну прадпрыемства, нісколькі не клапоцячыся аб падрыхтоўцы рабочых для кожнага цэху і працэсу работы прадпрыемства. Так, Шэйбаб'яднаньне дае для фабзавучаў зусім другі асартымэнт, чым асартымэнт прадпрыемстваў, для якіх гэтыя ФЗВ рыхтуюць кадры. У друкарні імя Сталіна некаторыя вучняў адрываюць ад заняткаў і перакідваюць непасрэдна ў цэх, дзе адчувалася патрэба ў рабочых.

Выключэньне спэцыяльнасьцей, якія павінны рыхтавацца праз ФЗВ, дакладная распрацоўка прафілёў гэтых спэцыяльнасьцей—першачарговая задача гаспадарчых аб'яднаньняў і заводакіраўніцтва. Для пасьпяховага правядзеньня гэтай работы патрэбен сілы актыўны ўдзел у гэтай справе інжынэрна-тэхнічных работнікаў аб'яднаньняў і прадпрыемстваў і шырокіх мас рабочых.

Пераходзячы да пытаньняў пастаноўкі навучаньня ў школах ФЗВ, неабходна спыніцца ў першую чаргу на становішчы **вытворчага навучаньня.**

Тэрміны прабываньня вучняў у майстарнях—вялікія. Майстэрні-ж па сваім абсталяваньні зьяўляюцца ў большасьці выпадкаў саматужнымі, са старымі зношанымі варштатамі і інструментамі і тэхнічна зусім адрозьніваюцца ад чавейшага абсталяваньня прадпрыемства. З другога боку, ёсьць выпадкі, калі майстэрні ў школе зусім адсутнічаюць (ФЗВ пры фабрыцы «Дзьвіна», пры панчошна-трыкатажнай фабрыцы, «Стройбучы») і вучні проста трапляюць у цэхі прадпрыемства ці на пабудову, дзе яны, ня маючы першачарговых навыкаў, ня могуць адразу арыентавацца ў вытворчых працэсах.

Вытворчыя праграмы часта базуюцца на выпадковых заказах ці вырабе дробных рэчаў для ўласных патрэб школы і прадпрыемства, якія (вырабы) ня маюць ніякай вытворчай і пэдагагічнай каштоўнасьці.

Ёсьць рад выпадкаў, калі фабзавучнікі скарыстоўваюцца на дапаможных работах, напрыклад, падпоска матар'ялаў, ачыстка памяшканьня і інш. (гарбарня імя Сталіна, керамічны завод, Копысь).

Неабходна рашучым чынам высунуць пытаньне аб перанясеньні цэнтру цяжару вытворчага навучаньня з майстэрань у цэхі прадпрыемства. Вытворчае навучаньне павінна, гаворым чынам, праводзіцца на асноўных аб'ектах вытворчасьці, якія маюць вытворчую і пэдагагічную каштоўнасьць. Вучэбныя майстэрні павінны адыгрываць дапаможную ролю, даваць пачатковыя вытворчыя навыкі.

У навучальныя пляны школ ФЗВ павінен быць уключан **увядны курс у вытворчасьць,** які знаёміць вучняў з прадпрыемствам у цэлым, з асноўнымі цэхамі, арганізацыяй працы і інш. Праграмы вытворчага навучаньня павінны прадугледжваць прахаджэньне вучнямі ўсіх асноўных працэсаў, аддаваць асноўную ўвагу спэцыяльнасьці, якая вывучаецца вучнямі. У гэтым і заключаецца адзін з асноўных прынцыпаў палітэхнізму.

«Карэнны недахоп школ у даны момант заключаецца ў тым, што навучальнае ў школе не дае патрэбнага аб'ёму агульнаасьветных ведаў і пэздавальняюча выраблае задачу падрыхтоўкі для тэхнікумаў і для вышэйшай школы зусім пісьменных людзей, добра ўладаючых асновамі навук (фізыка, хэмія, матэматыка, родная мова, геаграфія і інш.)»—гаворыцца ў пастаноце ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе. Пісьменнасьць, што гэта сталовішча цалкам адносіцца і да тэарэтычнага навучаньня ў фабзавучах.

Цесная ўвязка навучальнай работы з вытворчай дзейнасьцю, глеба для яўных найбольш спрыяюча ў школе ФЗВ, як школе вытворчай, не знаходзіць яшчэ належнага адбітку ў пастаноўцы ўсёй работы ФЗВ. Нават спэцыяльныя дысцыпліны, якія маюць самыя непасрэдныя адносіны да вытворчага навучаньня ў нашых ФЗВ, ня зьвязаны арганічна з ім і ў сувязі з гэтым трацяць сваё асноўнае значэньне.

Увязка тэарэтычнага навучаньня з вытворчай дзейнасьцю вучняў павінна знайсьці сваё канкрэтнае адмаляваньне ў адзіным вучэбна-вытворчым пляне школы.

Становішча праграмнага кіраўніцтва ФЗВ з боку Наркамасьветы зусім неадвальняючае. Па радзе дысцыплін праграмы на бягучы навучальны год для ФЗВ на базе сямігодкі прапанаваны тыя-ж, што і для індустрыяльных тэхнікумаў (грамадазнаўчы цыкль, хэмія, прафігіена), ня гледзячы на тое, што і тэрміны навучаньня, і тыпы навучальных устаноў розныя.

Зусім не распрацаваны праграмы для ФЗВ на базе 4-хгодкі, якія яшчэ маюць перавагу ў сыстэме нашай рэспубліканскай прамысловасьці. У выніку, кожная школа прымушана складаць праграмы самастойна, і, зразумела, якасьць гэтых праграм далёка не адпавядае сучасным запатрабаваньням. Неабходна з усёй рэзкасьцю паставіць перад НКАсьветы пытаньне аб узмацненьні праграмнага кіраўніцтва школамі фабзавучу, якія займаюць у сучасны момант вялікае месца ва ўсёй сыстэме асьветы.

Балючым месцам у рабоце ФЗВ і на сёньняшні дзень зьяўляецца рознастайнасьць папярэдняй агульна-асьветнай падр